Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

67 (7393)
ПЯТНІЦА
13
красавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Падпісанне Дагавора аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй. (1 стар.).

Дагавор аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных рэспублік і Югаславіяй. (1 стар.).

Прамова В. М. Молатава. (1 стар.).

Прамова Маршала Тіто. (1 стар.).

Ад Совецкага Інформбюро. Аператыўная зводка за 12 красавіка. (2 стар.).

Вышэй тэмпы і якасць сяўбы!

І. Казлоў — Працуюць скопам, ніякаякасна. С. Свірыдаў — Дапамога панярпеўшым гаспадаркам.

Д. Н. Пранішнікаў.—Аб шляхах павышэння ўраджайнасці. (2 стар.).

А. Усс. — Д. І. Фалвізін. (3 стар.).

Г. Спірыдонаў. — Газ з торфу. (3 стар.).

А. Чунаеў. — Кадры маладых рабочых. (3 стар.).

В. Пятроў. — Пра вялікае сэрца (бібліяграфія) (4 стар.).

Ваенныя дзеянні ў Заходняй Еўропе. (4 стар.).

Становішча на заходнім фронце. (4 стар.).

Становішча ў Грэцыі (4 стар.).

# Баявыя задачы сельскіх агітатараў

З кожным днём усё шырэй разгортваецца фронт палявых работ. Калгаснікі, работнікі МТС і соўгасаў, працоўныя аднаасобнікі рэспублікі выйшлі ў поле. Наступіў адказнейшы перыяд у жыцці вёскі. Веснавая сяўба гэтага года ў нашай рэспубліцы мае свае асаблівасці. Яна разгортваецца на зямлі, на якой каля трох год разбойнічалі, палілі і руйнавалі нямецка-фашысцкія бандыты. Гітлераўскія захопнікі нанеслі сельскай гаспадарцы выключна цяжкія страты. Баявая задача ўсіх працаўнікоў вёскі—не шкадуючы сіл, змагацца за аднаўленне сельскай гаспадаркі, каб у максімальна кароткія тэрміны дасягнуць даваеннага ўзроўню як па аб'ёму пасеўных плошчаў, так і па ўраджайнасці.

Задача гэтая цяжкая, але яна павінна быць вырашана. Яна і будзе паспяхова вырашана. Такая цвёрдая воля і непахісныя намеры вызваленай ад нямецкіх захопнікаў вёскі. Такая воля комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі, якая арганізоўвае і ўзнімае калгаснікаў і ўсіх працаўнікоў вёскі Совецкай Беларусі на гераічную працу ў імя нашай канчатковай перамогі над ворагам, у імя аднаўлення і росквіту ўсёй нашай гаспадаркі.

Вялікі вытворчы і палітычны ўздым вызваленай ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёскі. У адказ на заклік кубанскіх калгаснікаў і палтаўскіх трактарыстаў усё шырэй разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай. З розных куткоў рэспублікі паступаюць радасныя весткі аб масавым перавыкананні норм выпрацоўкі, аб высокіх тэмпах палявых работ. На старонках «Звязды» прыводзіліся ўжо факты завяршэння сяўбы ранніх яравых некаторымі калгасамі Палесся. Шырока разгортваюць сяўбу калгасы другіх абласцей рэспублікі. Старшыня калгаса імені Калініна, Дзержынскага раёна, тав. Бойка паведамляе, што ў калгасе ідзе масавая сяўба ранніх яравых культур. На 12 красавіка пасеяна ўжо 55 гектараў аўса, замест 53 гектараў па плану, пасеяна 10 гектараў ячменю, 7 гектараў лубіну на насенне. Праведзена баранаванне зяблевага ворыва на плошчы 110 гектараў. Паміж звенямі шырока разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Створаны яслі на 36 дзяцей.

Можна прывесці падобныя факты з другіх раёнаў. Аднак першыя поспехі ні ў якім разе не павінны ўскружыць галаву. У многіх калгасах, вёсках з першых дзён палявых работ было адзначана адставанне, якое можа прывесці да вельмі сумных вынікаў, калі адразу-ж не будуць прыняты меры. Задача заключаецца ў тым, каб адстаючых падцягваць да ўзроўню перадавікоў.

Каб паспяхова вырашыць пытанні тэмпаў і якасці сяўбы, усе нашы вясковыя партыйныя арганізацыі, кожны комуніст і комсамолец у паасобку павінны памятаць аб сваім свяшчэнным абавязку — аб палітычнай рабоце ў масах. Таварыш Сталін вучыць нас, што нельга дасягнуць трывалых гаспадарчых поспехаў, калі будзе дапушчан заняпад палітычнай работы ў масах. Асабліва цяпер, як ніколі, узрастае роля палітычнай агітацыі на вёсцы. Яна палкам павінна быць падпарадкавана задачам паспяховага правядзення веснавой сяўбы.

Неабходна, каб нашы агітатары знаходзіліся ў полі разам з аратымі, сейбітамі, баранавальшчыкамі, трактарыстамі. Трэба, каб яны агітавалі за тэмпы і якасць палявых работ перш за ўсё сваім асабістым прыкладам. Неабходна штодзённа інфарміраваць калгаснікаў, аднаасобнікаў аб важнейшых палітычных падзеях, аб поспехах Чырвонай Арміі, аб жыцці Совецкай краіны, аб нашым міжнародным становішчы. Усімі гэтымі пытаннямі жыва цікавяцца працоўныя вёскі.

Агітатары павінны так паставіць работу, каб атульна-палітычныя пытанні былі ўвязаны з канкрэтнымі задачамі калгаса, брыгады, звяна. Трэба на канкрэтных прыкладах настойліва растлумачваць гаспадарча-палітычнае значэнне барацьбы за ўраджай, каб кожны калгаснік, трактарыст, працоўны аднаасобнік быў прасякнут пачуццём высокай адказнасці перад радзімай, перад фронтам за сваю работу.

У ходзе падрыхтоўкі да сяўбы тысячы калгасаў, брыгад, звеньняў, трактарныя брыгады, вёскі ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай. Узята многа канкрэтных абавязацельстваў. Факты гэтыя сведчаць аб палітычным уздыме, аб жаданні калгаснікаў і ўсіх працоўных вёскі змагацца за хуткае аднаўленне сельскай гаспадаркі. Трэба паклапаціцца, каб соцыялістычным спаборніцтвам былі ахоплены ўсе, без выключэння, працаўнікі вёскі. Але гэтым ні ў якім разе нельга задаволіцца. Задача партыйных арганізацый, задача агітатараў—дапаматчы калгаснікам выканаць узятыя абавязацельствы. А для гэтага нашы агітатары павінны, не шкадуючы сіл, змагацца за правільную арганізацыю працы, за правільную расстаноўку людзей, за ўмелае спалучэнне работы трактарнага парка і жывога цягла, за выкарыстанне на палявых работах малапрадуктыўных кароў. Агітацыя не дасягне сваёй мэты, калі агітатар будзе праходзіць міма «дробязей», якія тармозяць тэмпы і якасць палявых работ. Агітацыя павінна быць дзейснай, аператыўнай, баявой, мэтаімкненай. Яна павінна быць накіравана на тое, каб на-хаду выправіць усе недахопы.

І ў перадавым калгасе не ўсе працуюць аднолькава, адны брыгады ідуць уперад, другія адстаюць, адны калгаснікі выконваюць нормы ў два—тры разы, другія не выконваюць. Агітатары павінны паклапаціцца аб тым, каб поспехі перадавікоў адразу-ж сталі здабыткам адстаючых. Трэба, каб перадавікі аказвалі ўздзеянне на адстаючых. Для гэтага павінны быць выкарыстаны ўсе сродкі: і таварыскія гутаркі, і насценная газета, і баявыя лісткі і г. д.

Надышоў час для паўсямеснага разгортвання масавых палявых работ. Надышоў час масавай сяўбы. Марудзіць, упускаць лепшыя тэрміны сяўбы—значыць нанесці вялікую шкоду будучаму ўраджаю. Задача ўсіх нашых партыйных, совецкіх, комсамольскіх арганізацый, задача актыва вёскі—мабілізаваць усе сілы на высокія тэмпы сяўбы, на высокую якасць усіх палявых работ, на выкананне ўсяго цыкла агратэхнічных мерапрыемстваў, на выкарыстанне ўсіх мясцовых магчымасцей. Узорна паставіць большэвіцкую агітацыю непасрэдна на полі, у брыгадзе, звяне — кроўная задача нашых партыйных арганізацый. Яна будзе садзейнічаць паспяховаму правядзенню веснавой сяўбы.

# ПАДПІСАННЕ ДАГАВОРА АБ ДРУЖБЕ, УЗАЕМНАЙ ДАПАМОЗЕ І ПАСЛЯВАЕННЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ПАМІЖ СОВЕЦКІМ САЮЗАМ І ЮГАСЛАВІЯЙ

У часе прабывання ў Маскве Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто і югаслаўскага Міністра Замежных спраў пана І. Шубашыча адбываліся перагаворы паміж Урадамі СССР і Югаславіі, якія пацвердзілі рашымасць абодвух краін сумесна з другімі Аб'еднанымі Нацыямі дабіцца хутчэйшага і канчатковага разгрому гітлераўскай Германіі, а таксама іх імкненне ўмацаваць дружбу і супрацоўніцтва народаў абодвух краін як у гэтай вайне, так і ў пасляваенны перыяд.

Гэтыя перагаворы, якія праходзілі ў атмасферы сардэчнасці і ўзаемнага разумення, закончыліся падпісаннем 11 красавіка Дагавора аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй.

Дагавор падпісан у Крэмлі па Упаўнаважанню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР Намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў СССР і Народным Камісарам Замежных Спраў В. М. Молатавым і па Упаўнаважанню Рэгенцкага Совета Югаславіі Старшынёй Совета Міністраў Югаславіі Маршалам І. Броз-Тіто.

Пры падпісанні Дагавора прысутнічаў Старшыня Совета Народных Камісараў СССР І. В. Сталін.

З боку Югаславіі пры падпісанні Дагавора прысутнічалі Міністр Замежных Спраў Югаславіі пан І. Шубашыч, Пасол Югаславіі ў СССР пан С. Сіміч, Міністр па справах Чорнагорыі генерал-лейтэнант Н. Джылас, Міністр Гандлю і Снабжэння пан Н. Петровіч, Міністр горнай прамысловасці пан Б. Андрееў, Начальнік Югаслаўскай Ваеннай Місіі ў СССР генерал-лейтэнант Р. Прыморац, пан Р. Нікалаевіч, пан Шэпіч.

З боку Совецкага Саюза прысутнічалі Намеснік Народнага Камісара Замежных Спраў А. Я. Вышынскі, Пасол СССР у Югаславіі І. В. Садчыкаў, Загадчык IV Еўрапейскага Аддзела НКЗС СССР А. А. Лаўрышчэў, Начальнік Совецкай Ваеннай Місіі ў Югаславіі генерал-маёр А. Ф. Кісялёў, С. Т. Базараў.

Пасля падпісання Дагавора В. М. Молатаў і Маршал І. Броз-Тіто абмяняліся прамовамі.

Ніжэй прыводзіцца тэкст Дагавора.

# ДАГАВОР

## аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Саюзам Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Югаславіяй

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і Рэгенцкі Совет Югаславіі, поўныя рашымасці давесці да канца вайну супроць нямецкіх захопнікаў;

жадаючы яшчэ больш умацаваць дружбу, што існуе паміж народамі Совецкага Саюза і Югаславіяй, якія вядуць сумесную барацьбу супроць агульнага ворага—гітлераўскай Германіі;

выказваючы няўхільнае імкненне забяспечыць песнае супрацоўніцтва народаў абодвух краін і ўсіх Аб'еднаных Нацый у часе вайны і ў мірны час і ўнесці свой уклад у справу пасляваеннай арганізацыі міру і бяспекі;

упэўненыя ў тым, што ўмацаванне дружбы паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй адпавядае жыццёвым інтарэсам абодвух народаў і будзе найлепшым чынам служыць справе далейшага эканамічнага развіцця абодвух краін;

рашылі заключыць з гэтай мэтай даны Дагавор і назначылі ў якасці сваіх Упаўнаважаных:

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік — Вячэслава Міхайлавіча **Молатава**, Народнага Камісара Замежных Спраў Саюза ССР;

Рэгенцкі Совет Югаславіі — Маршала Іосіпа **Броз-Тіто**, Старшыню Совета Міністраў Югаславіі;

якія пасля абмену сваімі поўнамоцтвамі, знойдзенымі ў належнай форме і ў поўным парадку, згадзіліся аб ніжэйнаступным:

### Артыкул 1.

Кожны з Высокіх Дагаварваючыхся Бакоў будзе прадаўжаць барацьбу сумесна з другім бокам і з усімі Аб'еднанымі Нацыямі супроць Германіі да канчатковай перамогі. Высокія Дагаварваючыяся Бакі абавязваюцца аказваць адзін аднаму ваенную і іншую дапамогу ў гэтай барацьбе ўсімі сродкамі, якія ёсць у іх распараджэнні.

### Артыкул 2.

Калі адзін з Высокіх Дагаварваючыхся Бакоў аказаўся-б у пасляваенны перыяд уцягнутым у ваенныя дзеянні з Германіяй, якая аднавіла-б сваю агрэсіўную палітыку, або з якой-небудзь дзяржавай, што аб'ядналася-б з Германіяй непасрэдна або ў якой-небудзь іншай форме ў такой вайне, другі Высокі Дагаварваючыйся Бок неадкладна акажа Дагаварваючамуся Боку, уцягнутаму ў ваенныя дзеянні, ваенную і іншую дапамогу і падтрыманне ўсімі сродкамі, якія ёсць у яго распараджэнні.

### Артыкул 3.

Высокія Дагаварваючыяся Бакі заяўляюць, што будуць удзельнічаць, у духу самага шчырага супрацоўніцтва, ва ўсіх міжнародных дзеяннях, накіраваных на тое, каб забяспечыць мір і бяспеку народаў, і будуць поўнасцю ўносіць сваю долю ў справу ажыццяўлення гэтых высокіх мэт.

Высокія Дагаварваючыяся Бакі заяўляюць, што прымяненне гэтага Дагавора будзе знаходзіцца ў адпаведнасці з міжнароднымі прынцыпамі, у прынцыпі якіх яны ўдзельнічалі.

### Артыкул 4.

Кожны з Высокіх Дагаварваючыхся Бакоў абавязваецца не заключаць якога-небудзь саюза і не прымаць удзелу ў якойпсбудзь каліцыі, накіраваных супроць другога Высокага Дагаварваючагася Боку.

### Артыкул 5.

Высокія Дагаварваючыяся Бакі заяўляюць, што і пасля скančэння гэтай вайны яны будуць дзейнічаць у духу дружбы і супрацоўніцтва, у мэтах далейшага развіцця і ўмацавання эканамічных і культурных сувязей паміж народамі абодвух краін.

### Артыкул 6.

Гэты Дагавор уступае ў сілу неадкладна пасля яго падпісання і падлягае ратыфікацыі ў магчыма кароткі тэрмін. Абмен ратыфікацыйнымі граматамі будзе зроблен у Белградзе як мага хутчэй.

Гэты Дагавор астанецца ў сіле на працягу дваццаці год з моманту яго падпісання. Калі адзін з Высокіх Дагаварваючыхся Бакоў у канцы гэтага дваццацігадовага перыяду не зробіць за адзін год да тэрміну заявы аб сваім жаданні адмовіцца ад Дагавора, ён будзе аставацца ў сіле на наступныя 5 год, і так кожны раз, да таго часу, пакуль адзін з Высокіх Дагаварваючыхся Бакоў не зробіць за адзін год да скančэння бягучага пяцігоддзя пісьмовага папярэджання аб сваім намеры спыніць яго дзеянне.

У сведчанне чаго Упаўнаважаныя падпісалі гэты Дагавор і прыклалі да яго свае пячаткі.

Складзен у г. Маскве, 11 красавіка 1945 года, у двух экземплярах, кожны на рускай і сербска-харвацкай мовах, прычым абодва тэксты маюць [illegible] ровную сілу.

**За ўпаўнаважанню Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР**
**В. МОЛАТАЎ.**

**За ўпаўнаважанню Рэгенцкага Совета Югаславіі**
**І. БРОЗ-ТІТО.**

# ПРАМОВА В. М. МОЛАТАВА

Маршал Тіто, паны!

Дагавор паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве, які я меў чэсць па даручэнню Совецкага Урада толькі што падпісаць, замацоўвае адносіны дружбы і цеснае супрацоўніцтва, што склаліся паміж народамі СССР і Югаславіі ў іх сумеснай барацьбе супроць агульнага ворага—нямецкіх захопнікаў.

Я ўпэўнен, што гэты Дагавор будзе садзейнічаць паскарэнню разгрому гітлераўскай Германіі і паслужыць справе Аб'еднаных Нацый, якія імкнуцца да дасягнення трывалага міру і бяспекі ў Еўропе.

Надышоў час, якога доўга чакалі народы Совецкага Саюза і Югаславіі. Саюз і дружба, якія змацаваны крывёю нашых братоў у сумеснай барацьбе супроць нямецкага фашызма і яго саюзнікаў, набылі сваё новае выражэнне ў нашым Дагаворы. Мы падалі рукі адзін аднаму, каб давесці нашу вызваленчую вайну да пераможнага канца і каб нашы народы,—кожны сваім шляхам,—маглі ісці ўперад па шляху нацыянальнай незалежнасці і сапраўднай свабоды.

Совецка-югаслаўскі Дагавор будзе сустрэт з глыбокім задавальненнем народамі нашых краін. Ён сустрэне дружаственае спачуванне сярод усіх свабодалюбівых народаў і знойдзе асабліва сардэчны водгук сярод славянскіх народаў, якія ўбачаць у ім новае падмацаванне ў іх барацьбе за сваю слаўную будучыню.

Гэты дагавор будзе найлепшым чынам садзейнічаць развіццю дружаственага супрацоўніцтва ў справе эканамічнага адбудаўлення нашых краін, якія так моцна пацярпелі ад ненавісных захопнікаў. Дагавор стварае таксама трывалыя асновы для далейшага ўмацавання эканамічных і культурных сувязей паміж Совецкім Саюзам і дэмакратычнай Югаславіяй у пасляваенны перыяд.

Совецкі Саюз, які ажыццяўляе вялікую справу Леніна—Сталіна, і дэмакратычная Югаславія, якая заняла пачэснае месца сярод народаў, што змагаюцца з фашызмам, будуць з гэтага часу яшчэ цясней звязаны паміж сабою дружбай, узаемнай дапамогай, усебаковым супрацоўніцтвам.

Дазвольце мне, Маршал Тіто, віншаваць Вас з падпісаннем Дагавора, які на доўгія годы будзе служыць справе нашых народаў і ўсіх Аб'еднаных Нацый.

# ПРАМОВА МАРШАЛА ТІТО

Пан Маршал Сталін, пан Народны Камісар Замежных Спраў!

Падпісаны сёння Дагавор паміж Югаславіяй і Совецкім Саюзам з'яўляецца адным з самых значных укладаў у справу адзінства свабодалюбівых народаў у іх барацьбе супроць напысцкай Германіі і адной з асноў будучай бяспекі Еўропы.

Зусім натуральна, што ў імкненні забяспечыць сваё свабоднае развіццё югаслаўскія народы апіраліся і будуць апіравацца на магутную каліцыю вялікіх саюзнікаў, загартаваную ў барацьбе супроць агульнага ворага, якая астаецца і на пасляваенны перыяд.

Гэты Дагавор з'яўляецца для нас асновай мірнага будаўніцтва нашай будучыні. У той-жа час ён з'яўляецца ажыццяўленнем надзей народаў Югаславіі, якія заўсёды імкнуліся жыць у цеснай дружбе з магутным Совецкім Саюзам.

Дагавор з'яўляецца адначасова вынікам сумеснай гераічнай барацьбы Чырвонай Арміі і Югаслаўскай арміі супроць германскіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў. Дагавор заклаў моцны фундамент для забяспечання мірнага развіцця новай Югаславіі.

Дазвольце мне, пан Молатаў, таксама віншаваць і Вас з падпісаннем Дагавора паміж Югаславіяй і Совецкім Саюзам аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве. Гэты Дагавор з'яўляецца выкананнем самых даўніх імкненняў народаў Югаславіі—жыць у цеснай дружбе з вялікім совецкім народам, які пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра Сталіна ў гэтай самай цяжкай у гісторыі барацьбе даў звышчалавечыя афіары за перамогу над агульным ворагам свабодалюбівых народаў, за свабоду і незалежнасць малых народаў і, у першую чаргу, за свабоду і незалежнасць Югаславіі.

## Абед у Старшыні Совета Народных Камісараў СССР І. В. Сталіна ў чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто

11 красавіка Старшыня Совета Народных Камісараў СССР І. В. Сталін даў абед у Крэмлі ў чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто.

На абедзе прысутнічалі Маршал І. Броз-Тіто, Міністр Замежных Спраў Югаславіі пан І. Шубашыч, Пасол Югаславіі ў СССР пан С. Сіміч, Міністр па справах Чорнагорыі генерал-лейтэнант М. Джылас, Міністр Гандлю і Снабжэння пан Н. Петровіч, Міністр горнай прамысловасці пан Б. Андрееў, Начальнік Югаслаўскай Ваеннай Місіі ў СССР генерал-лейтэнант Р. Прыморац, а таксама суправаджаючыя Маршала Тіто асобы і члены пасольства Югаславіі ў СССР.

З совецкага боку прысутнічалі М. І. Калінін, В. М. Молатаў, А. І. Мікаян, Л. П. Берыя, Г. М. Маленкоў, Л. М. Кагановіч, Н. М. Швернік, Н. А. Вазнесенскі, Н. А. Булганін, А. Н. Касыгін, Адмірал Флота Н. Г. Кузнецоў, А. І. Шахурын, Б. Л. Ванніка́ў, Д. Ф. Усцінаў, В. А. Малышэў, А. Г. Зверэў, А. Я. Вышынскі, Старшыня Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных Г. М. Папоў, Старшыня ВЦСПС В. В. Кузнецоў, Галоўны Маршал артылерыі Н. Н. Воранаў, Генерал Арміі А. І. Антонаў, Пасол СССР у Югаславіі І. В. Садчыкаў, Маршал авіяцыі Ф. Я. Фалалеў, Народны Камісар Замежных Спраў РСФСР А. Я. Лаўрэнцьеў, Народны Камісар Замежных Спраў УССР Д. З. Мануільскі, Генерал Арміі А. В. Хрулёў, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, генерал-палкоўнік Б. М. Караткоў, Загадчык IV Еўрапейскага Аддзела НКЗС СССР А. А. Лаўрышчэў, Н. Г. Пальгуноў, Загадчык Пратакольнага Аддзела НКЗС СССР Ф. Ф. Малачкоў, генерал-лейтэнант А. С. Гундараў, Начальнік Совецкай Ваеннай Місіі ў Югаславіі генерал-маёр А. Ф. Кісялёў, генерал-маёр М. П. Кутузаў і другія.

Абед прайшоў у дружаскай абстаноўцы і ў ажыўленых гутарках совецкіх дзеячоў з югаслаўскімі гасцямі.

## *УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЯЎ САЮЗА ССР*

11 красавіка Намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. Я. Наталевіч уручыў ордэны і медалі групе ўзнагароджаных.

За доблесць і мужнасць, праяўленыя ў партызанскай барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і асаблівыя заслугі ў развіцці партызанскага руху, ордэны Чырвонага Сцяга ўручаны тт. Караткову А. М., Бортніку Н. І., Арлоўскаму В. К.; ордэн Айчыннай вайны І ступені—тав. Жукаву В. І.; ордэны Айчыннай вайны II ступені — тт. Бірмуйзаеву К. Б., Радзіонаву Т. Ф., Зарапову Б. Г., Мітрашкіну Ф. Ф.; ордэны Чырвонай Звязды — тт. Дурэйку А. М., Барансарока Г. С., Корань В. П., Асадчуку Г. П. — усяго 15 чалавек. Ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга атрымліваюць тт. Пільпіенка Ф. М., Лайцейка В. П., Медаль «За адвагу» — тав. Юркоў Ф. А., медалі «За баявыя заслугі» — тт. Шэучук Г. Д., Каладзенка Ф. Ф.

За паспяховае выкананне плана хлебанарыхтовак 1944 года ордэны атрымліваюць група партыйных і совецкіх работнікаў. Ордэны Айчыннай вайны І ступені ўручаны тт. Храпко Н. Б., Шабаль К. Е., Кажамякіну А. М., Кавальчуку Н. А.; ордэны Айчыннай вайны II ступені—тт. Харыну Т. Д., Спешэц Я. Г., Таклёнак П. М., Куцькс В. І., Цяплухіну А. С.

За ўзорнае выкананне задання ўрада і праяўленыя пры гэтым адвагу і мужнасць ордэны і медалі атрымліваюць работнікі Паркамата Дзяржаўнай Бяспекі БССР. Ордэны Чырвонай Звязды ўручаны тт. Жалезнікаву А. В., Коба С. Г., медаль «За адвагу»—тав. Юхнавец І. А.

Ордэны «Материнская слава» І ступені атрымалі мацеры, якія нарадзілі і выхавалі 9 дзяцей, тт. Кірылёнак Е. П., Забіноўская Б. А., Касцевіч Л. Е., Кунгер Е. І., Тарасік П. Т., Фрыдры-Мурашка І. В. Ордэны «Материнская слава» II ступені—мацеры, якія нарадзілі і выхавалі 8 дзяцей, тт. Блізнюк А. І., Веташкіна Ф. К., Воранава М. А., Каранкевіч М. А., Кобзава У. В., Таболіна А. А. Ордэны «Материнская слава» III ступені ўручаюцца тт. Герасімавай М. А., Касьянавай К. Ф., Русак Н. І., Зайцавай А. Я., Сімаковай А. К., Стасюкевіч Л. В., Мрачкоўскай М. В.; «Медали материнства» І ступені — тт. Церашковай С. С., Крэсік Н. П. «Медали Материнства» II ступені—тт. Груша Т. С., Сіняковіч М. Ф., Філіповіч С. А., Валковіч О. П.

Пасля ўручэння ўзнагарод таварыш Наталевіч сардэчна віншаваў узнагароджаных.

(БЕЛТА).

## Смерць Прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі Франкліна Рузвельта

**ВАШЫНГТОН, 12 красавіка. (ТАСС).** Сёння ў 20 гадзін 35 мінут па Грынвічу ў Уорм Спрынгсе (штат Георгія) памёр Прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі Франклін Дэлано Рузвельт. Смерць паследвала ад крывезліяння ў мозг.

**ВАШЫНГТОН, 12 красавіка. (ТАСС).** Белы Дом (рэзідэнцыя Прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі) аб'явіў, што паніхіда па Рузвельту адбудзецца ў суботу пасля палудня ў Вашынгтоне. Пахаванне адбудзецца ў Гайд-Парку ў нядзелю ў другой палавіне дня.

Белы Дом апублікаваў заяву, у якой гаворыцца, што віцэ-прэзідэнт ЗША Трумэн быў выклікан у Белы Дом, дзе місіс Элеонора Рузвельт інфарміравала яго аб смерці Рузвельта. Дзяржаўны сакратар Стэцініус таксама быў інфарміраван аб гэтым. Склікана паседжанне кабінета.

## Прыём Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. І. Калініным Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто

11 красавіка, у Крэмлі, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. І. Калінін прыняў Старшыню Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто.

На прыёме прысутнічаў Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. Ф. Горкін.

# Ад Совецкага Інформбюро

### АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 12 КРАСАВІКА

На працягу 12 красавіка на тэрыторыі Чэхаславакіі на паўночным усходзе і поўначы ад БРАЦІСЛАВЫ, войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта з баямі занялі горад і чыгуначную станцыю СКАЛІЦА і больш 30 другіх населеных пунктаў, у тым ліку ТРЭНЧ, ТЕПЛА, ОПАТОВА, КАХАНОЎЦЭ, ГАЛУЗІЦЭ, ГОРНЫ-БЗІНЦЭ, ВРБОЎЦЭ, РОДЭЙОЎ, КАТОЎ, ГОЛІЧ, КОПЧАНІ. На паўночным усходзе ад ВЕНЫ войскі фронта занялі на тэрыторыі Аўстрыі населеныя пункты ДРЭЗІНГ, ЕДЭНШПАЙГЕН, ЛОЙДЭСТАЛЬ, ЭРДПРЭС, ХОХЕНРУПЕРСДОРФ, АУЭРШТАЛЬ, БОКФЛІС, АДЭРКЛАА, РААСДОРФ, ЭСЛІНГ, ГРОС ЭНЦЭРСДОРФ і чыгуначную станцыю ЭЙБЕСБРУН, перарэзаўшы чыгунку і шасе ВЕНА—БРНО.

У ВЕНЕ войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта вялі вулічныя баі ў гарадскім раёне, які знаходзіцца між Дунайскім каналам і ракой ДУНАЙ, дзе занялі больш 60 кварталаў. На захадзе і паўднёвым захадзе ад горада СОМБАТЭЛЬ войскі фронта, прадаўжаючы наступленне, занялі на тэрыторыі Аўстрыі горад ГЮСІНГ (НЕМЕТУЙВАР) і больш 40 другіх населеных пунктаў, у тым ліку МАРКТ АЛАУ, ОЛБЕНДОРФ, ОБЕРНЕЙБЕРГ, МІХЕЛЬ, ЧАНШЭНДОРФ, ШТЭЙНГРАБЕН, ЕЛЬТЭНДОРФ. У баях за 11 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон больш 5.000 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: танкаў і самаходных гармат—34, бронетранспарцёраў—38, палявых гармат — 208, кулямётаў — 270, аўтамашын— 498, трактараў і цягачоў — 187, паравозаў — 34, чыгуначных вагонаў — 1.535, складаў з ваеннай маёмасцю — 17.

На другіх участках фронта — істотных змен не было.

За 11 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 50 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 22 самалёты праціўніка.

* * *

### УДАРЫ АВІЯЦЫІ ЧЫРВОНАСЦЯЖНАГА БАЛТЫЙСКАГА ФЛОТА ПА КАРАБЛЯХ І ТРАНСПАРТАХ ПРАЦІЎНІКА

9 і 10 красавіка авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота наносіла ўдары па ваенных караблях і транспартах немцаў у парту Пілау і ў адкрытым моры на паўночным захадзе ад Пілау. У выніку гэтых удараў патоплены два нямецкія мінаносцы, два вартавыя караблі, дзесяць транспартаў агульным водазмяшчэннем у 60.000 тон і адзін танкер водазмяшчэннем у 2.000 тон. Апрача таго, прамым попаданнем бомб пашкоджаны: адзін мінаносец, адзін вартавы карабель і сем транспартаў праціўніка.

* * *

На паўночным усходзе і поўначы ад Браціславы нашы войскі прадаўжалі наступленне. Праціўнік пабудаваў у паласе гор Люле Карпаты інжынерныя загароды, многа дзотаў і аказвае ўпорнае супраціўленне. Совецкія часці, якія дзейнічаюць у цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці, настойліва прасоўваюцца ўперад. Нашы падразаздзяленні прарываюцца ў тылы немцаў і раптоўнымі ўдарамі дэзарганізуюць іх абарону. Занята некалькі горных сяленняў, ператвораных гітлераўцамі ў апорныя пункты. Совецкія пехацінцы, якія наступаюць уздоўж усходняга берага ракі Морава, імклівай атакай занялі буйны населены пункт Голіч. Развіваючы поспех, нашы байцы прасунуліся ўперад на 5 кілометраў і выбілі немцаў з чэхаславацкага горада Скаліца. Захоплены палонныя і трафеі.

* * *

На паўночным усходзе ад Вены войскі 2-га Украінскага фронта з баямі прасоўваліся ўперад. Немцы ўвялі ў бой яшчэ адну танкавую дывізію, буйныя сілы пяхоты і неаднаразовымі контратакамі працуюць не дапусціць выхаду нашых часцей на тылы сваёй венскай групіроўкі. Перадольваючы ўпорнае супраціўленне праціўніка, нашы войскі авалодалі чыгуначнай станцыяй Эйбесбрун і перарэзалі чыгунку і шасейную дарогі Вена—Брно. Такім чынам, у распараджэнні нямецкіх войск, якія дзейнічаюць у раёне Вены, асталася адна чыгунка, што ідзе ўздоўж берага Дуная на паўночны захад. Дарога абстрэльваецца совецкімі артылерыстамі, якія выйшлі на паўднёвы бераг Дуная, на паўночны захад ад аўстрыйскай сталіцы. Адбіваючы варожыя контратакі, войскі фронта спалілі і падбілі 40 танкаў і самаходных гармат і 18 бронетранспарцёраў праціўніка. Узята ў палон больш 500 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплены трафеі, у ліку якіх 4 самалёты і 250 чыгуначных вагонаў з ваеннымі грузамі.

* * *

Войскі 3-га Украінскага фронта прадаўжалі весці баі на вуліцах Вены. Совецкія часці яшчэ ў некалькіх месцах пераправіліся праз Дунайскі канал і, адбіваючы контратакі немцаў, крок за крокам прасоўваюцца ўперад. Асабліва жорсткія баі ідуць у раёне паўночна-заходняга вакзала. Штурмавыя атрады, дзейнічаючы сумесна з артылерыстамі, блакіруюць вузлы супраціўлення немцаў і ліквідуюць іх. Праціўнік нясе цяжкія страты. За дзень баёў знішчана больш 4.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

У баях за вызваленне Вены совецкія байцы праяўляюць высокую воінскую вывучку, смеласць і адвагу. На адной вуліцы нямецкі танк моцным агнём перашкаджаў прасоўванню нашай пяхоты. Гвардыі старшы сяржант Бурлакоў подпоўз да варожага танка і кінуў бутэльку з гаручай сумессю. Танк загарэўся. Нямецкіх танкістаў, якія прабавалі выратавацца бегствам, сяржант знішчыў агнём з аўтамата. Адзяленне сяржанта Плаходава атакавала дом, у якім умацаваліся гітлераўцы. Нашы байцы ўварваліся ў дом, знішчылі групу немцаў і ўзялі ў палон 9 салдат праціўніка. Гвардыі чырвонаармеец Валетаў на працягу дня знішчыў 7 нямецкіх салдат і аднаго афіцэра.

* * *

Узяты ў палон нямецкі палкоўнік Ганс Янус расказаў: «На працягу доўгіх месяцаў воінскія часці і грамадзянскае насельніцтва будавалі абарончыя збудаванні на тэрыторыі Памераніі. Мы лічылі, што ля гэтых магутных умацаванняў рускія войскі будуць спынены. Аднак нашы разлікі не апраўдаліся. Чырвоная Армія сарвала і апракінула планы нямецкага камандавання. У Памераніі совецкія войскі акружылі і знішчылі рад нямецкіх злучэнняў. Дывізія «Меркіш-Фрыдланд» была сфарміравана ў канцы студзеня 1945 года. Новая дывізія праіснавала вельмі нядоўга і была разбіта. Салдаты, якія асталіся ў жывых, разыйшліся па лясах і былі ўзяты ў палон».

# ВЫШЭЙ ТЭМПЫ І ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ!

* * *

## УПЕРАДЗЕ ТРАКТАРЫСТ КАНСТАНЦІН БУЛАЎКА

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Перад выездам ў поле трактарыст Калінкавіцкай МТС Канстанцін Булаўка абавязаўся выпрацаваць за сезон на 15-сільным трактары 900 гектараў. Канстанцін Булаўка заключыў дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з трактарыстам Нікалаем Малашонкам, які таксама абавязаўся выпрацаваць 900 гектараў.

Доўга і старанна трактарысты рыхтавалі свае машыны да палявых работ. Канстанцін Булаўка першым у МТС выехаў у поле і прыступіў да ворыва. За першы дзень ён перакрыў дзённае заданне амаль у два з палавінай раза, узараўшы 9 гектараў, замест нормы ў 3,8 гектара. Вытворчы поспех натхніў трактарыста на яшчэ лепшую работу. З дня ў дзень ён павышае выпрацоўку. За 8 рабочых дзён Канстанцін Булаўка ўзараў больш 60 гектараў глебы і зэканоміў многа гаручага.

Нядрэнных вынікаў дабіўся і Нікалай Малашонак. За шэсць дзён ён узараў 43 гектары. Якасць ворыва як у першага, так і ў другога трактарыста прызнана добрай.

Вялікую дапамогу трактарыстам аказвае брыгадзір трактарнай брыгады Грыгорый Булаўка, які наладзіў добры тэхнічны догляд машын.

Трактарыст гэтай МТС Владзімір Ільічэнка і Васіль Дашковіч узаралі па 30 гектараў кожны. Усяго трактарамі Калінкавіцкай МТС ужо ўзарана больш 300 гектараў глебы.

Ал. ЛЯСНЫ.

## ЧАМУ СТАЯЦЬ ТРАКТАРЫ?

Палявыя работы ў калгасах Гомельшчыны набываюць масавы характар. Усюды ідзе сяўба ранніх яравых культур. У многіх раёнах засеяны сотні гектараў аўса, ячменю, пшаніцы. Асабліва добра ідуць палявыя работы і сяўба ў калгасах Церахоўскага і Гомельскага раёнаў. Тут падрыхтавана многа глебы, значная частка якой засеяна.

Перадавыя МТС вобласці своечасова вывелі трактары на калгасныя палі. Многія трактарысты за першыя дні работы дабіліся добрых вынікаў. Новабеліцкая і Будакашалёўская МТС бездакорнай работай трактараў аказваюць калгасам вялікую дапамогу па своечасоваму правядзенню сяўбы.

Аднак не ва ўсіх машынна-трактарных станцыях вобласці так абстаяць справы. З раду раёнаў паведамляюць аб тым, што трактары, якія прыйшлі на калгасныя палі, стаяць і не працуюць з прычыны дрэннага іх рамонту. Старшыня Горвальскага сельсовета, Рэчыцкага раёна, тав. Ісаенка паведамляе, што трактар Азершчынскай МТС, які прыйшоў на палі калгаса «Ударнік», стаіць і не працуе. Трактар аказаўся няспраўным і патрабуе рамонту.

Яшчэ горш абстаяць справы ў Лоеўскай МТС. Тут многія трактары не могуць выйсці ў поле з-за адсутнасці свячэй. Дарэчы аб гэтым ведае намеснік начальніка аблземаддзела тав. Сініхін. Аднак ён не прымае дзейсных мер, каб хутчэй пусціць ў ход трактары.

В. ЛЛУКОЎ,
М. РАШЧЫНСКІ.

У Крыўіцкай МТС. Старшы трактарыст Васілій Грыгор'евіч Паплеўка, які абавязаўся гэтай вясной на газагенератарным трактары узараць 600 гектараў, навучае курсанта-трактарыста І. Л. Якімовіча тэхніцы ваджэння трактара.

На здымку: курсант І. Л. Якімовіч за рулём трактара, справа—старшы трактарыст В. Г. Паплеўка.

Фото А. Карніцкага.

## ПРАЦУЮЦЬ СКОПАМ, НІЗКАЯКАСНА

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»). Кілометраў за 30 на ўсход ад Магілева, на прыдняпроўскіх узгорках раскінуліся палі калгасаў Мастоцкага сельсовета, Магілеўскага раёна. Хутка сохне супясчаная глеба. Грэбяні леташняга зяблева пыляць пад подыхамі ветру. Каб захаваць у глебе вільгаць, даўно трэба было зяблева паскародзіць, але гэта работа тут пакуль не праведзена.

Ужо некалькі дзён як калгасы сельсовета праводзяць палявыя работы. Да іх адносяцца калгас імені Сталіна, «Чырвоны пераменнік», імені Будзённага, імені Молатава. У раёне гэтыя калгасы значацца на добрым рахунку. Коней тут дастаткова, рабочых рук таксама. Але наперакор усяму палявыя работы разгортваюцца ў калгасах слаба.

Мы пабывалі на палях калгаса імені Молатава. Было апоўдні. Надвор'е сприяла работам. Зямля даўно падсохла. Але толькі гадзін з дня 3 дня пачалі выязджаць на поле першыя аратыя. Адразу заўважылася неарганізаванасць у іх працы. Аратыя ідуць адзін за другім. І калі стаў першы конь, спыняюцца і астатнія. Аруць на невялікім кавалачку зямлі, хоць побач упаўне прыгодная для ворыва плошча. На поле выехалі толькі на частцы коней, астатнія стаяць у канюшні.

Такі-ж малюнак прышлося наглядаць на палях калгаса імені Сталіна. І тут не ўсе коні скарыстоўваюцца на палявых работах. Аратыя працуюць скопам. Каля 20 плугоў ідуць адзін за другім. Доўгая вераніца раз-по-разу спыняецца ад якой-небудзь непаладкі ў аднаго з аратых. Ды і коні не ўсе аднолькавыя. Таму слабасільныя коні ў такой суталацы хутка выбываюць са строю.

Старшыня калгаса «Чырвоны пераменнік» тав. Кошэлева не ведае, што робіцца ў яе калгасе.

— Зямля яшчэ сырая, — гаворыць яна. —Управімся пасеяць.

І калгас не спяшаецца з разгортваннем палявых работ.

Амаль ва ўсіх калгасах аратымі працуюць хлапчукі і дзяўчаты. Яны, вядома, не маюць вопыту, а таму аруць з агрэхамі і вельмі мелка. Ніхто ў калгасах не дадумаўся прыставіць да іх пажылога, вопытнага калгасніка, які-б кіраваў работай маладых аратых і вучыў іх.

Як у Мастоцкім, так і іншых сельсоветах Магілеўскага раёна палявыя работы разгортваюцца слаба яшчэ і таму, што ў калгасах спадзяюцца на дапамогу трактараў. А трактары размяркоўваюцца няправільна. Часта іх пасылаюць туды, дзе дастаткова пягла. Так, у калгасе імені Сталіна, Мастоцкага сельсовета, з Лупалаўскай МТС прыехаў трактар. Ён узараў некалькі гектараў і спыніў работу.

Трэба заўважыць, што ворыва трактарам праведзена неахайна, з вялікімі агрэхамі. Усё гэта атрымліваецца толькі таму, што за прапай трактарыстаў ніхто не сочыць і не правярае якасці работ.

Зімою ў раёне многа гаварылі пра арганізацыю звенняў. На палях-жа звенняў не відаць. Яны створаны былі толькі на паперы.

Глеба падсохла так, што ёсць поўная магчымасць разгортваць масавыя палявыя работы і сяўбу. Аднак у раёне не спяшаюцца з разгортваннем масавых работ. Не арганізавана тут барацьба за захаванне ў глебе вільгаці—гэтага важнейшага фактара ў барацьбе за высокі ўраджай.

І. КАЗЛОЎ.

## Дапамога пацярпеўшым гаспадаркам

БАРАНАВІЧЫ, (Спец. кар. «Звязды»). У Гарадзішчанскім раёне заканчваецца зварот зямлі беззямельным і малазямельным сялянскім гаспадаркам, якая была ў іх адабрана нямецкімі захопнікамі. За апошні час 1.900 гаспадарак атрымалі 3.200 гектараў зямлі.

Цяпер ва ўсіх вёсках раёна ідуць палявыя работы і сяўба яравых культур. У многіх вёсках арганізаван збор насення тым гаспадаркам, якія найбольш пацярпелі ад немцаў. У вёсках створаны звенні дапамогі бясконным гаспадаркам. У першую чаргу дапамога аказваецца сем'ям франтавікоў, партызан і інвалідаў Айчыннай вайны.

У Валпянскім сельсавеце перад пачаткам палявых работ былі праведзены сходы сялян. На гэтых сходах сяляне абавязаліся правесці сяўбу ў спісныя тэрміны, па добра апрацаванай глебе, дапамагчы бясконным гаспадаркам апрацаваць і абсемяніць свае палі. Дэпутат сельсовета, селянін вёскі Бортнікі Платон Шчэрба, выступаючы на сходзе, заявіў:

— Ад імені ўсіх сялян вёскі выношу вялікую падзяку совецкай уладзе, Чырвонай Арміі і таварышу Сталіну за вызваленне нас з нямецкай няволі. Мы зноў сталі вольнымі і шчаслівымі, сталі гаспадарамі сваёй зямлі. Больш ніколі сюды не вернецца панскі і нямецкі бізун. Я абавязваюся засеяць і вырасціць на сваім полі добры ўраджай, а таксама дапамагчы апрацаваць яравы клін сям'і франтавіка Страмскага.

Селянін Міхаіл Жынкевіч абавязаўся дапамагчы апрацаваць зямлю бясконнай гаспадарцы Зінаіды Снежка, муж якой загінуў на фронце. Зінаіда Снежка была беззямельная. Цяпер яна атрымала 2 гектары зямлі, але не мела насення. Валпянскі сельсавет выдаў ёй з сабранага фонду 100 кілограмаў аўса, 80 кілограмаў ячменю і 200 кілограмаў бульбы.

Партызанскай сям'і Зінаіды Сурмы, якая нядаўна атрымала 3,5 гектара зямлі, сельсавет выдаў 120 кілограмаў аўса, 90 кілограмаў ячменю і 300 кілограмаў бульбы.

— У адказ на вялікія клопаты совецкай улады аб нас, сялянах, — заявіла Зінаіда Сурма, — мы пастараемся вырасціць багаты ўраджай. Сваёй упорнай працай на палях дапаможам нашай роднай Чырвонай Арміі хутчэй знішчыць немцазвера.

Зінаіда Сурма ўжо засеяла на атрыманай зямлі 0,5 гектара аўса.

С. СВІРЫДАЎ.

# Аб шляхах павышэння ўраджайнасці

*Акадэмік Д. Н. ПРАНІШНІКАЎ*

Яшчэ Катон у старажытным Рыме сказаў, што для атрымання добрых ураджаяў трэба «па-першае, араць, і падругое, араць, і па-трэцяе — угнойваць». Само сабой зразумела, што землі, асабліва вызваленых раёнаў, маюць патрэбу перш за ўсё ў добрай апрацоўцы і ачышчэнні іх ад пустазелля. Апрача таго, яны маюць патрэбу ў багатым угнаенні. Асабліва гэта датычыць падзолістых і пясчаных глеб Беларусі і ўсіх глеб нячорназёмнай паласы РСФСР.

Але якраз у абласцях, дзе гаспадарылі немцы, пытанне аб угнаенні палёў з'яўляецца найбольш вострым. У гады акупацыі вялася драпежніцкая гаспадарка, палі спусташаліся паўторнымі пасевамі без ўнясення ўгнаенняў. Аб сяўбе канюшыны і гутаркі не было. Большая частка жывёлы была або знішчана, або вывезена ў Германію. Паблізу чыгунак, дзе стаяла многа нямецкіх войск, жывёла знішчана на 100 процантаў. Ды і наогул ў Беларусі наўрад ці ўцалела чвэрць коней і 25—30 процантаў рагатай жывёлы, якая была ў рэспубліцы да вайны.

На мінеральныя ўгнаенні ў часе вайны разлічваць цяжка — хімічная прамысловасць працуе перш за ўсё на патрэбы абароны. Але і пасля вайны для ўгнаення зямель пад хлябы можна разлічваць пераважна на фасфаты і калійныя солі, азотная-ж прамысловасць доўга яшчэ будзе абслугоўваць не збожжавую прадукцыю, а тэхнічныя культуры: бавоўнік, лён, цукровыя буракі, а таксама сады і гароды. Ды і бульба павінна атрымаць як мага больш азоту.

І пакуль прамысловасць не забяспечыць азоцістымі ўгнаеннямі гэтыя культуры,—а да гэтага яшчэ вельмі далёка,—нельга разлічваць на атрыманне азоту пад хлябы. Ды і наогул для гіганцкай плошчы, занятай збожжавымі, патрэбна больш танная крыніца азоту, чым сінтэтычная прадукцыя тукавай прамысловасці.

Такім з'яўляецца перш за ўсё гной. Але пры недахваце жывёлы ў вызваленых раёнах прыходзіцца думаць і аб замяніцелях гною, і аб тым, як павялічыць збор гною ад хатняй жывёлы. Там, дзе ёсць торф, трэба прымяняць у стойлах тарфяную падсцілку (торф падсцілаецца пад салому), перасліваць гной з торфам на гноішчы, рабіць і чыста тарфяныя кампосты з увядзеннем у іх попелу. А дзе будуць лішкі саломы пры недахваце жывёлы, карысна прыгатаўляць штучны гной. У гэтым выпадку, як і пры тарфяных кампостах, багатай крыніцай азоту (і бактэрый) могуць з'яўляцца фекальныя масы. Месцамі можна прымяняць для прыгатаўлення кампосту лясную падсцілку, якая ўтрымлівае спажыўных вяшчэстваў больш, чым салома.

Другой галоўнай мерай узбагачэння глебы азотам з'яўляецца расшырэнне пасеваў канюшыны. Іменна канюшына ўзбагачае азотам і гной, і глебу. Таму велізарнае значэнне мае ўвядзенне правільных севазваротаў з канюшынай, прычым у радзе канюшынасеючых абласцей плошча пад імі можа быць даведзена да 25 процантаў ад агульнай пасеўнай плошчы.

У Кіеўскай вобласці, напрыклад, чыстая сяўба канюшыны, пры аднагадовым карыстанні ёю, дае найлепшы фон для азімых. У нячорназёмнай паласе пераважае тып двухгадовага карыстання сумессю канюшыны з пімафеяўкай, пры васьміпольным севазвароце, з сяўбой яравых пасля траў. А ў Казахстане, дзе канюшына не ўдаецца, мімаволі мы павінны мець пасевы чыстых каласавых, якія займаюць поле на некалькі год, хоць-бы гэта былі малапрадуктыўныя жытнякі і пырнікі. Значыцца, у гэтай жывёлагадоўчай гаспадарцы дарэчы траваполле. На захадзе азатыраванне глебы і атрыманне корму павінна супадаць з сяўбой канюшыны, на паўднёвым усходзе прыходзіцца дзейнічаць па-іншаму. Наогул шаблону пры ўвядзенні севазвароту не павінна быць. Правільныя севазвароты павінны выходзіць з канкрэтных умоў кожнага раёна.

Але, апрача гною і канюшыны, ёсць трэцяя крыніца азоту, якая не залежыць ад прамысловасці. І гэтая крыніца можа стаць вельмі буйнай. Справа ў тым, што, апрача бабовых харчовага і кармовага крыжаванняў, ёсць яшчэ адна група — гэта бабовыя, якія высяваюцца на зялёнае ўгнаенне. Роля іх да гэтага часу была невялікай. Але цяпер яна павінна вельмі ўзрасці. Павялічваць плошчы пад зялёнаўгнаіцелямі можна ў грандыёзных размерах без усялякіх страт для іншых культур. У нас ёсць велізарныя плошчы папараў: каля 25 мільёнаў гектараў. Калі адкінуць засушлівы поўдзень і гаварыць толькі аб паўночнай палавіне гэтай плошчы, то і тады гэтае мерапрыемства будзе здольным канкурыраваць з канюшынасеяннем па колькасці звяззвамага азоту.

Дзеянне зялёнага ўгнаення праяўляецца значна хутчэй, чым дзеянне канюшыны. Бо калі мы пасеем канюшыну вясной 1945 года, то толькі ў 1946 годзе яна дасць укос, толькі ў 1947 годзе будзе зааран гной, атрыманы ад скармлівання гэтай канюшыны, і толькі ў 1948 годзе атрымаецца прырост ураджаю жыта. А сяўба лубіну на зялёнае ўгнаенне ў 1945 годзе дасць павышэнне ўраджаю ўжо у 1946 годзе. Таму асабліва важна іменна цяпер, пакуль плошча пад канюшынай яшчэ не даведзена да нормы, усімі сродкамі выкарыстаць магчымасць узбагачэння глебы азотам з дапамогай зялёнага ўгнаення.

Даволі вядомы бліскучыя работы Новазыбкаўскай вопытнай станцыі, створанай Е. К. Алексеевым у цяжкі час 1918 года. Імі даказана магчымасць буйнага падняцця ўраджайнасці бедных пяскоў Чарнігаўшчыны з дапамогай лубіну.

Але калі раней прымяненне зялёнага ўгнаення абмяжоўвалася пясчанымі глебамі Чарнігаўшчыны і Беларусі, цалкам умесным быў звычайны сіні лубін, то цяпер, калі ставіцца пытанне аб усіх глебах нячорназёмнай паласы, уключаючы і поўнач, ранейшая форма ўжо не прыгодна. Для поўначы неабходна зрабіць замену ранейшага звычайнага лубіну іншай формай — канадскім лубінам, які не з'яўляецца зернавым, але дае больш зялёнай масы. Даная форма да гэтага часу была мала пашырана, але ў далейшым павінна заняць першае месца. Па-першае, таму, што пытанне аб забяспечанні насеннем для нас вырашаецца значна лягчэй і абласць пашырэння яго на поўнач нічым не абмежавана, а па-другое, таму, што гэты лубін родзіцца і на сувязных глебах. Таму зялёнае ўгнаенне становіцца універсальнай мерай падняцця ўраджайнасці ўсіх глеб нячорназёмнай паласы.

Ранейшая яравая форма сініга лубіну мае буйнае насенне, таму прыходзіцца высяваць яго на гектар у колькасці 180—200 кілограмаў. Апрача таго гэты лубін цёплалюбівы, і на поўначы ад Масквы яго насенне не выспявае. Форма-ж, прапанаваная аўтарам, мае дробнае насенне, яго патрабуецца па гектар усяго 30 кілограмаў. Атрыманне ўласнага насення магчыма і на поўначы, аж да Архангельска. Цвіценне «азімага» лубіну пачынаецца на 40 дзён раней, чым яравой формы. Гэта дазваляе і на поўначы з поспехам прымяняць зялёнае ўгнаенне пад азімае жыта. Не гледзячы на кароткае лета, калгасы будуць заворваць большую масу, чым пры сяўбе яравога лубіну.

Радам вопытаў, праведзеных у розных абласцях, даказана высокае ўгноевае дзеянне канадскага лубіну. Калі раней лічылася, што ён прыгодны толькі для культуры па-за севазваротам, як пастаўшчык «укоснага ўгнаення», то ў апошні час даныя Судагодскага вопытнага поля паказалі, што падсеў шматгадовага лубіну пад авёс у мэтах заворвання на наступны год пад жыта цалкам апраўдае, што пацверджана вопытамі ў Маскоўскай, Смаленскай, Калінінскай і Молатаўскай абласцях.

У Смаленскай вобласці, напрыклад, былі атрыманы наступныя даныя (сярэднія за тры годы) пры такім спосабе прымянення зялёнага ўгнаення:

| | Ураджай азімага жыта ў цэнтнерах з гектара | |
|---|---|---|
| Кантроль | 8,4 | 87,4 |
| Гной 18 тон | 12,3 | 151,6 |
| Гной 36 тон | 15,9 | 168,3 |
| Лубін шматгадовы | 15,0 | 176,8 |

Такім чынам, дзеянне лубіну было блізкім да дзеяння 36 тон гною. Яшчэ больш спрыяючыя вынікі былі атрыманы на Уральскай занальнай станцыі (Молатаўская абласць), дзе дзеянне лубіну было значным нават на трэцяй культуры.

Ураджай у цэнтнерах з гектара:

| | жыта | Лён па жыту: сала ма | Лён па жыту: насенне | Ячмень пасля Ільну |
|---|---|---|---|---|
| Кантроль | 7,0 | 11,0 | 2,5 | 6,9 |
| Лубін, узаны ў цвіценні | 19,1 | 21,2 | 5,3 | 12,1 |

Не прыводзячы вялікай колькасці прыкладаў, спынімся на пытанні атрымання насення азімага лубіну. Аўтарам быў прапанован і часткова ўжо ажыццёўлен Наркамземам наступны план фарсіраванага размнажэння гэтага насення ў нас ў СССР: 10 цэнтнераў насення, сабранае ў канцы ліпеня—пачатку жніўня 1944 года, было адпраўлена на поўдзень (Кубань) для высеву яго ў верасні — кастрычніку таго-ж года, тады як на поўначы яго прышлося-б высяваць толькі вясной 1945 года і ўраджай насення быў-бы атрыман толькі ў 1946 годзе. Дзеля эканоміі насення сяўба была праведзена шырокарадна (адлегласць—30 сантыметраў), пры якой можна высяваць толькі 4—5 кілограмаў на гектар пры ўмове наступнага матыжання міжрадзяў (даныя Валакаламскага вопытнага поля).

Ураджай насення павінен атрымацца ў канцы мая або пачатку чэрвеня 1945 года. Пры добрай культуры можна атрымаць 4—5 цэнтнераў, г. зн. сам-сто. Калі ўсе гэтыя ўмовы захаваны, то 10 цэнтнераў насення, пасеянага ў 1944 годзе, павінна даць 1.000 цэнтнераў насення ў 1945 годзе. Пры сяўбе іх на поўдні ў тым-жа 1945 годзе можна атрымаць збор у 100 тысяч цэнтнераў у 1946 годзе і 10 мільёнаў у 1947 годзе. Але гэта ўжо больш, чым трэба. Але нам важна паказаць, што размножыць насенне лубіну можна вельмі хутка. Апрача таго, размнажэнне насення павінна ісці і на поўначы, пераважна на запольных (па-засевазваротных) участках, дзе лубін можа даваць ураджай насення штогод на працягу 8—10 год.

Насенне, якое будзе сабрана на Кубані ў 1945 годзе ў пачатку лета, трэба зноў пасеяць у тым-жа годзе, прычым, апрача Кубані, сяўба можа быць праведзена ў больш паўночных абласцях, напрыклад, у Разанскай, Тульскай, Орлоўскай, Чарнігаўскай і ў паўднёвай Беларусі, пры ўмове своечасовай дастаўкі насення і высеву яго паміж 15 ліпеня і 1 жніўня. Высяваць яго трэба на асобых участках, выдзеленых на папарных палях. У заходняй частцы магчыма і пажніўная сяўба, пасля ўборкі жыта; так могуць быць закладзены насенныя пітомнікі, якія на працяту доўгага раду год будуць даваць насенне для паўночнай часткі Саюза.

Як толькі недахват насення будзе ліквідаван, увядзенне культуры лубіну на поўначы можа стаць мерай вялікага дзяржаўнага значэння. Калі ўявіць, што ў будучым лубін зойме папаравыя палі на плошчы ў 10 мільёнаў гектараў і будзе даваць на кожны гектар па 30 тон зялёнай масы, якая цалкам замяняе 30 тон гною, то гэта-ж усяроўна, што павялічыць колькасць прымяняемага ў нас гною на 300 мільёнаў тон. Паколькі да гэтага часу ў нас вывозілася толькі каля 200 мільёнаў тон гною (даваенныя даныя), то ўвядзенне лубіну будзе адпавядаць павелічэнню колькасці прымяняемага гною ў два з палавінай раза (500 мільёнаў тон замест 200).

Такім чынам, падняцце ўраджаю хлябоў у прадстаячыя годы павінна базіравацца на аснове поўнага выкарыстання гною, расшырэння канюшынасеяння і шырокага прымянення лубіну на зялёнае ўгнаенне. Але прамысловасць павінна даць калій і фосфар для канюшыны. Гэта адкрывае шлях па крайняй меры да падваення ўраджаю хлябоў супроць сучаснага ўзроўню. Азотная-ж прамысловасць пакуль павінна абслугоўваць тэхнічныя культуры. І толькі пасля радыкальнай перабудовы тэхнікі звязвання азоту і неабходных эканамічных мерапрыемстваў можна будзе гаварыць аб значным удзеле азотна-тукавай прамысловасці ў справе падняцця ўраджаяў зернавых на яшчэ большую вышыню.

# КАДРЫ МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ

Перад сістэмай дзяржаўных прапоўных зерваў пастаўлена вялікая задача— хтаваць высокакваліфікаваных рабо- х і рабочых масавых прафесій для на- й сацыялістычнай прамысловасці, бу- ўніцтва, чыгуначнага транспарта і дру- х галін народнай гаспадаркі краіны. Нам абходна рыхтаваць рабочых, якія-б у сканаласці валодалі сваёй прафесіяй, хаваных у духу бязмежнай адданасці раве большэвіцкай партыі.

Задача гэта асабліва ўзрасла ва ўмо- х вялікай Айчыннай вайны, калі многа здравых рабочых прызвана ў рады Чыр- най Арміі, а разбураная нямецка-фа- шысцкімі вылюдкамі народная гаспадарка трабуе аднаўлення. А таму важнейшымі шыніцамі папаўнення кваліфікаванымі бочымі і работніцамі масавых прафесій ых прадпрыемстваў з'яўляюцца рамес- кія, чыгуначныя вучылішчы і школы брычна-заводскага навучання.

У Беларускай ССР аднавілі сваю дзей- сць і куюць кадры маладых рабочых льш 50 рамесніцкіх, чыгуначных ву- лішчаў і школ ФЗН. У іх навучаецца ля 11 тысяч юнакоў і дзяўчат. Яны рымліваюць веды па спецыяльнасцях— мочнікаў паравозных машыністаў, дзя- рных па станцыі, слесараў, токараў, ктраманцёраў, друкароў, наборшчыкаў, ляроў, песляроў, штукатураў, камен- ыкаў і другіх прафесій. Больш 3.000 ладых рабочых будаўнічых спецыяльна- ей, якія скончылі школы ФЗН, пра- юць ужо на прадпрыемствах Беларусі, конваючы і перавыконваючы нормы працоўкі.

Так, былыя вучні школы ФЗН № 16 рада Гомеля—слесар Іван Колас, ка- ншчыкі Міхаіл Ігнацька і Віктар Гаў- ленка, песляры Васілій Купеба і Еўге- й Трухан, столяр Нікалай Шыкавец, укатур Таццяна Мікулік працуюць па му разраду, выконваючы па паўтары і е нормы за змену. Усе яны ўзнага- жаны значком «Отличный восстанови- ль». Былы вучань школы ФЗН № 4 го- да Гомеля пясляр Васілій Пракапенка цуе па 5-му разраду на аднаўленчых ботах Беларускай чыгункі, сістэматычна конваючы па 2 нормы за змену. Сто- р 5-га разрада былы вучань Васілій дзведзеў сістэматычна перавыконвае е выторчыя заданні. Каменшчык Мі- ін Харкоў і штукатур Міля Варанкова юць штодзённа па 150—180 процан- ў нормы.

23 маладым рабочым, якія раней скон- лі школу ФЗН № 4 у Гомелі, а пяпер выдатна працуюць на аднаўленні, начальнік упраўлення Беларускай чыгункі генерал-дырэктар пяці 3-га ранга тав. Краснабаеў вынес падзяку і выдаў грашовыя прэміі.

Многа выпускнікоў будаўнічых школ працуе на розных прадпрыемствах. Былыя вучні школы ФЗН № 5 горада Касцюкоўкі—штукатуры Ксеня Еўсеенка і А. Тузава, столяр Владзімір Бокараў, пясляр Гарасім Вераснёў працуюць на гомельскім шклозаводзе імені Сталіна і зарэкамендавалі сябе тут як добрыя кваліфікаваныя рабочыя. Яны дабіваюцца высокай прадукцыйнасці працы, сістэматычна перавыконваюць дзённае заданне. Вучні Нікалай Гутароеў, Якаў Касабукін, якія скончылі школу ФЗН № 6 у горадзе Добрушы, працуюць зараз на фабрыцы «Герой працы», выконваючы зменныя заданні на 120—150 процантаў.

Больш 60 вучняў, скончыўшых школы ФЗН, працуюць у гэтых школах у якасці памочнікаў майстраў па вытворчаму навучанню.

Самаадданай працай маладыя рабочыя дапамагаюць гераічнай Чырвонай Арміі граміць ненавісных фашысцкіх захопнікаў.

Каля 5.000 вучняў школ ФЗН у красавіку і маі канчаюць вытворчае навучанне і атрымліваюць кваліфікацыю: сталяроў, песляроў, штукатураў, электраманцёраў і другіх прафесій. Яны раз'ехаліся па прадпрыемствах і будоўлях Беларусі для самастойнай работы.

Кіраўнікам прадпрыемстваў, будоўляў і чыгуначнага транспарта неабходна загадзя падрыхтаваць арганізаваную сустрэчу маладым рабочым, забяспечыць іх добра абсталяванымі інтэрнатамі, стварыць неабходныя культурна-бытавыя ўмовы для плённай працы.

Партыйным, совецкім, комсамольскім і прафсаюзным арганізацыям неабходна ўдзяліць максімум увагі і аказаць практычную дапамогу гаспадарнікам у падрыхтоўцы жылля і культурна-масавага абслугоўвання выпускнікоў школ ФЗН, каб гэта садзейнічала далейшаму вытворчаму, культурнаму і палітычнаму росту маладых рабочых. Неабходна акружыць пастаяннымі бацькоўскімі клопатамі маладых рабочых—новае папаўненне рабочага класа.

**А. ЧУНАЕЎ.**

**начальнік аддзела мабілізацыі, размеркавання і ўліку пры рэспубліканскім упраўленні працоўных рэзерваў БССР.**

# ТРЫ МЕСЯЦЫ ВУЧОБЫ

Будынак, які вызначан для школы ФЗН 39, быў амаль палкам разбуран нямец- -фашысцкімі захопнікамі.

Праломы ў сценах, зіяючая пустэча акон, аманыя рамы... усё трэба было пачы- ць спачатку: рамантаваць будынак, на- ць кантынгент вучняў, даставаць ін- румент.

Адначасова з аднаўленнем будынка вуч- навучаліся сталярнай і электраманцёр- й справе. Пад кіраўніцтвам майстра Шэ- чава былі зроблены фуганкі, рубанкі, мескі і іншыя інструменты.

Тры месяцы ўпорнай вучобы і работы і свае вынікі. Маладыя сталяры ўжо пускаюць гатовую прадукцыю. У ста- рнай майстэрні можна ўбачыць сталы, фы, табурэткі, зробленыя рукамі вучняў інструментам свайго ўласнага вырабу. абліва вызначаюцца ў рабоце і вучобе Парахневіч, Гарэлік, Салютцоў, Се- сцьянаў, Фрыдбург, Філіпчык.

Пад кіраўніцтвам тэхніка Зюзвяк спрыт- працуюць на станках маладыя дзяўча- . Вучаніца Спасава на фрэзероўцы но- жак для крэслаў і сталоў выконвае норму на 110 процантаў. Перавыконваюць норму і вучаніцы Кавалёнка і Галамзік.

Вучні-электраманцёры электрафіцыравалі будынак школы; яны асвятлілі жылыя пакоі, чырвоны куток, сталовую. Таксама імі вырабляюцца рубільнікі, праводзяцца дробныя рамонтныя работы і чыстка матораў у механічным цэху.

У вольны ад работы час вучні навучаюцца ў гуртках самадзейнасці. Хор пад кіраўніцтвам майстра - электраманцёра С. Шчаглова нядаўна выступіў на агляднзе гарадской самадзейнасці і атрымаў добрую ацэнку. Працуе струнны, харавы і танцавальны гурткі.

Вучні працуюць, вучацца, павышаюць свой культурна - палітычны ўзровень. У чырвоным кутку школы вісіць карта ходу падзей на франтах Айчыннай вайны.

Ужо ў гэтым годзе школа фабрычна-заводскага навучання № 39 дасць краіне кваліфікаваныя рабочыя кадры.

**Ю. ЛЫСКОЎ.**

г. Бабруйск.

# МАЙСТРЫ СКАРАСНОЙ АПРАЦОЎКІ ПАЯЗДОЎ

МАГІЛЕЎ, 9 красавіка. (БЕЛТА). За апошнюю дэкаду пяршынства ў перадмайскім спаборніцтве магілеўскіх чыгуначнікаў заваявала змена манеўровага дыспетчара тав. Нікіценка. Умела арганізаваўшы скарасную апрацоўку паяздоў, яна, як правіла, адпраўляе паязды датэрмінова. У часе дзяжурства гэтай змены паязды стаяць на станцыі не больш 15 мінут пры норме ў 35—45 мінут.

Выдатна працуе у гэтай змене саставіцель паяздоў тав. Пятроў, аглядчык вагонаў тав. Бычкоў і стрэлачнік тав. Нікалаева.

Змена тав. Нікіценка абавязалася да дня Першага Мая дабіцца яшчэ большых поспехаў у сваёй рабоце .

## Зрываюць выпуск хімікатаў

Мінскі абласны дрэўхімсаюз еднае 14 лесахімічных і дрэваапрацоўчых прамыслова-кааператыўных арцелей. Прадпрыемствы дрэўхімсаюза павінны вырабляць скіпідар, выпальваць драўляны вугаль, вырабляць каламазь, розную мэблю, будаўнічую арматуру і іншае.

З першых дзён работы кіраўнікі саюза і арцелей не патурбаваліся, каб хутчэй і поўнасцю аднавіць свае прадпрыемствы і пусціць іх на поўную магутнасць. Тут прадаўжаюць «раскачвацца», спадзяючыся на тое, што хто-небудзь гэта зробіць за іх.

У выніку, у 1944 годзе Мінскі аблдрэўхімсаюз і на палавіну не выканаў свайго плана.

Здавалася-б, што кіраўнікі аблдрэўхімсаюза (старшыня тав. Русак, сакратар партарганізацыі тав. Кацнельсон) прымуць неабходныя захады, каб у 1945 годзе забяспечыць выкананне вытворчых планаў. Але на справе гэтага не атрымалася. У першым квартале гэтага года прадпрыемствы аблдрэўхімсаюза прапавалі яшчэ горш. У студзені па ўсёй сістэме дрэўхімсаюза было выпушчана на 98.400 рублёў прадукцыі, што складае 30,3 процанта месячнай праграмы, а ў лютым план быў выканан на 26,6 процантаў, тое-ж назіраецца і ў сакавіку.

Лесахімічная арцель «Аб'яднанне», якая знаходзіцца ў Смалявічах, мае чатыры катлы і з іх два зусім спраўныя. Усё-ж на працягу 6 месяцаў свайго існавання арцель не дала ніякай прадукцыі. Старшыня арцелі тав. Несперaў з сваім штатам невядома за што атрымліваюць заработную плату. Такое-ж становішча і ў Чэрвеньскай арцелі імені Орджанікідзе, дзе таксама ёсць два спраўныя катлы.

Для забяспечання выпуску смалы і скіпідару ў першым квартале 1945 года ўрадам БССР было адпушчана 15 тысяч кубаметраў перастою хвоі. Але безыніцыятыўныя кіраўнікі Мінскага аблдрэўхімсаюза нічога не зрабілі, каб выкарыстаць гэты лес. За 80 дзён план нарыхтоўкі перастою выканан усяго на 15 процантаў. Сарван і план нарыхтоўкі асмолу.

Такое становішча ставіць пад пагрозу і далейшае выкананне планаў па выпуску хімікатаў.

Асобныя прадпрыемствы дрэўхімсаюза павінны выпускаць каламазь, у якой з наступленнем вясны маюць вялікую патрэбу калгасы. Але выраб каламазі не арганізаван, хаця для гэтай мэты ёсць звыш 30 тон смалы.

**Г. СЯРГЕЕНКА.**

# Д. І. ФАНВІЗІН

***(Да 200-годдзя з дня нараджэння).***

Дзеніс Іванавіч Фанвізін нарадзіўся 14 красавіка 1745 года ў Маскве. Вучыўся Фанвізін спачатку ў гімназіі пры Маскоўскім універсітэце, потым перайшоў ва універсітэт. У гімназіі Фанвізін дасканала авалодаў латынскай і новымі еўрапейскімі мовамі, пачаў займацца літаратурай.

Будучы ў гімназіі, Фанвізін упершыню знаёміцца і з тэатрам. У 1758 годзе куратар (папячыцель) універсітэта павёз Фанвізіна разам з дзесяцю лепшымі вучнямі гімназіі ў Пецербург, каб прадставіць іх імператрыцы і паказаць «плады гімназіі». У Пецербургу Фанвізін убачыў Ламаносава, прысутнічаў у прыдворным тэатры па прадстаўленні камедыі дацкага драматурга Гольберга. Спектакль у прыдворным тэатры, сустрэчы з вядомымі артыстамі таго часу Волкавым і Дзмітрэўскім—усё гэта зрабіла на Фанвізіна вялікае ўражанне і выклікала ў ім цікавасць да тэатра і драматургіі.

Цікавасць да літаратуры ў Фанвізіна праявілася вельмі рана. Яшчэ ва універсітэце Фанвізін рабіў пераклады для кнігапрадаўпоў і між іншым пераклаў байкі дацкага пісьменніка Гольберга, які потым сваімі драматургічнымі творамі аказаў уплыў на раннюю камедыю Фанвізіна «Брыгадзір».

Курса ва універсітэце Фанвізін не скончыў. У 1762 годзе ён пакінуў універсітэт і паступіў на службу ў калегію замежных спраў. У гэтыя годы Фанвізін быў надзвычай таварыскім, астраумным і вясёлым чалавекам. Яго «вострыя словы» разносіліся па ўсёй сталіцы і стварылі Фанвізіну ворагаў і прыяцеляў.

У гэты-ж час Фанвізін стварае свае лзве сатыры: байку «Лісіца Казнадзей» і «Паслание слугам». У байцы «Лісіца Казнадзей» аўтар вельмі астраумна і едка высмейвае афіцыяльныя пахвалы манархам у прамовах і одах і дае рэзкую асуджальную характарыстыку тыранічнай дзейнасці пара. У «Пасланні слугам» Фанвізін выступае супроць асноў паркоўнага вучэння. Фанвізін заяўляе, што ён не ведае, на што створан гэты свет, і што створан ён,—ва ўсякім выпадку, у частцы чалавечага грамадства,—агідна, і зусім не так мудра, як аб гэтым запэўнялі абаронцы царквы. У гэтым-жа творы Фанвізін дае злую сатыру і рэзка нападае на духавенства. Ён гаворыць, што

«Попы стараются обманывать народ,
Слуги—дворецкого, дворецкие—господ,
Друг друга—господа, а знатные бояре
Нередко обмануть хотят и государя...»

Аб гэтым творы Фанвізіна Белінскі сказаў, што ён «перажыве ўсе тоўстыя тамы таго часу».

У 1766 годзе з'явілася першая арыгінальная камедыя Фанвізіна «Брыгадзір». Камедыя мела вялікі поспех. У ёй Фанвізін высмеяў дзікасць, варварства, тупаум'е і подласць дваранства. Апрача таго, у камедыі крытыкуецца «галаманія», г. зн. знадворнае ўсваенне рускім дваранствам французскай культуры і пагарда малатых дваран да сваёй радзімы і да сваёй роднай рускай мовы.

У 1777—1778 гг. Фанвізін падарожнічаў па Еўропе і даволі доўга прабыў ва Францыі. У гэты час там ужо наспяваў рэволюцыйны ўзрыў. Феадальны лад развальваўся. Буржуазія ішла на штурм улады. Францыя таго часу зрабіла на Фанвізіна пяжкае ўражанне. Ён ясна бачыў набліжэнне крушэння старога рэжыма, але ён не быў ахоплен пафасам надыходзячых перамог буржуазіі. У Францыі ён убачыў астаткі той-жа тыраніі, якую ён ненавідзеў у Расіі. Ён высмейвае самавольства, разбэшчанасць улады і «вышэйшага грамадства» старога парадку. Але са здзіўляючай зоркасцю бачыць ён і фальш буржуазных «свабод» пры захаванні ўлады грошай. «Першае права кожнага француза,—гаворыць ён,—ёсць вольнасць, але сапраўднае становішча яго ёсць рабства, бо бедны чалавек не можа прахарчаваць сябе інакш, як рабскай работай... Словам, вольнасць ёсць пустое імя, і права мопнага астаецца правам вышэй усіх законаў».

Фанвізіна цікавіла Францыя не толькі і не столькі сама па сабе, колькі таму, што ён спадзяваўся, вывучыўшы яе, лепш і больш глыбока зразумець шляхі развіцця Расіі. У імя сваёй радзімы ён мысліў і тварыў. І гарачая любоў да радзімы прымушала яго шукаць лякарстваў ад язваў, якія раз'ядалі яе. Але Фанвізін пераканаўся ў тым, што шлях Францыі не дае шчасця народу. Для Расіі Фанвізін хоча больш, чым развіццё капіталізма.



Чаго іменна Фанвізін хоча—ён і сам ясна не ўяўляе сабе. Але ён ведае, што ў Расіі дрэнна, і ведае, што іменна ў Расіі перш за ўсё дрэнна: рабства і самадзяржаўна-чыноўніцкая дэспатыя. Пакуль і тое і другое існавалі Фанвізін задыхаўся на радзіме і мітусіўся ў пошуках вызвалення.

Падарожнічаючы па Еўропе, Фанвізін наведаў і Германію. І ў пісьме да сястры з Нюрэнберга дае правільную і цікавую характарыстыку Германіі. «Наогул магу сказаць бесстаронне,—піша Фанвізін,—што ад Пецербурга да Нюрэнберга баланс з боку нашай айчыны перацягвае значна—тут ва ўсім генеральна горш нашага: людзі, коні, зямля... словам: **у нас усё лепш**, мы больш людзі, чым немцы».

У 1782 годзе закончана была Фанвізіным камедыя «Недарасль» — галоўная праца яго жыцця. Камедыя ў першы раз была пастаўлена на сцэне прыдворнага тэатра ў бенефіс вядомага артыста таго часу Дзмітрэўскага, які іграў ролю Старадума. Захаваліся сведчанні сучаснікаў аб гэтым спектаклі. Тэатр быў перапоўнен. Публіка, якая атрымала «непараўнальнае задавальненне», «кідала кашалькі» на сцэну.

У камедыі «Недарасль» Фанвізін даў не толькі сацыяльную сатыру на расійскіх памешчыкаў, але і выступіў супроць палітыкі памешчыцкага ўрада екацерынінскага часу. Дваранская «маса», памешчыкі сярэдняй рукі і больш дробныя, невукная, непісьменная дваранская правінцыя, складалі сілу ўрада. Барацьба за ўплыў на правінцыю была барацьбой за ўладу. Ёй аддаў Фанвізін вялікую ўвагу ў камедыі «Недарасль». Дваранская правінцыя выведзена на сцэну і паказана гледачу ярка і жыва. Аб самым урадзе толькі гаворыць герой камедыі. Паказаць са сцэны прыдворную знаць, вяльмож Фанвізін не адважыўся, ды і не меў магчымасці. Але ўсё-ж у камедыі «Недарасль» гаворыцца аб двары, аб уладзе. У камедыі Фанвізін выказвае свае сацыяльныя погляды вуснамі Старадума, які з'яўляецца ідэйным героем камедыі. У гутарках з другімі персанажамі п'есы—з Праўдзіным, Мілонам і Соф'ей—Старадум выказвае мысліі, яўна звязаныя з сістэмай поглядаў Фанвізіна на ўрад. Старадум з абурэннем абрушваецца на разбэшчаны двор Екацерыны II, на ўрад, які кіраваўся не лепшымі людзьмі краіны, а «любімцамі», выскачкамі і кар'ерыстамі. У апошняй дзеі камедыі Фанвізін выказвае вуснамі Старадума свае заветныя мысліі. Перш за ўсё ён выказваецца супроць бязмежнага прыгнёту і рабства сялян. «Прыгнятаць рабствам сабе падобных,—гаворыць ён,—беззаконна».

Ставячы ў сваёй камедыі пытанні палітыкі дваранскай дзяржавы, Фанвізін не мог не закрануць у ёй пытання аб сялянстве, аб прыгонным праве. Фанвізін паказаў у камедыі, што скапіціны і прастаковы не кіруюць сялянамі, а мучаць і бессаромна грабяць іх, імкнучыся выціснуць з іх пабольш даходаў. Яны даводзяць прыгонную эксплаатацыю да апошніх межаў, разараюць сялян.

Камедыя «Недарасль» мае для нас гістарычнае значэнне, як мастацкі помнік эпохі. Мы бачым у камедыі даўно прайшоўшае жыццё. Яна васпаўняе і ажыўляе нашы ўяўленні аб екацерынінскай эпосе, яна дае нам яркі малюнак быту рускіх правінцыяльных дробна-памесных дваран другой палавіны XVIII века. Камедыя прадаўжае жыць на рускай і беларускай сцэнах, выклікае цікавасць у нашага сучаснага совецкага гледача, хвалюе і кліча да размышлення аб нашым гістарычным мінулым.

На камедыі Фанвізіна выхавалася цэлая плеяда лепшых рускіх актораў: Шчэпкін, Ленскі, Мачалаў, Садоўскі, Масквін. Камедыя «Недарасль» аказала велізарны ўплыў на развіццё і нашых беларускіх актораў: Владамірскі, Ржэцкая, Бірыла і другія.

Імкненне да вызвалення чалавечай асобы ад пут невуцтва і прыгнечання, якім пранізана камедыя «Недарасль», дало права Пушкіну назваць Фанвізіна «другам свабоды». У сваім рамане «Еўгені Онегін» Пушкін, успамінаючы аб тэатры, які ён старанна наведваў у юнацтве, пісаў:

«Волшебный край! Там в стары годы,
Сатиры смелой властелин,
Блистал Фонвизин, друг свободы...»

Камедыя «Недарасль» была напісана ў 1782 годзе. У ёй Фанвізін рэзка крытыкаваў нравы і звычаі правінцыяльнага дваранства. А ў 1783 годзе ён смела выступае супроць прыдворных нраваў у журнале «Собеседник любителей российского слова»,—у тым самым журнале, у якім прымала ўдзел сама Екацерына II. Тут Фанвізін змясціў «Пытанні», якія накіраваны да аўтара «Былей и небылиц», г. зн. да Екацерыны II. У сваіх «Пытаннях» Фанвізін выказваў нездаволенне адстаўкай «многіх добрых людзей». Сярод пытанняў было і такое: «Чаму ў ранейшыя часы шуты і балагуры чыноў не мелі, а зараз маюць і вельмі вялікія?». «Пытанні» паявіліся ў журнале ў суправаджэнні адказаў Екацерыны—імператрыца папракала аўтара «Пытанняў» у «свободоязычии». Екацерына не магла перанесці рэзкіх выступленняў аўтара «Недарасля» і рашыла не пускаць яго твор у друк.

Пазней Фанвізін напісаў твор «Усеагульная прыдворная граматыка». Гэта была вельмі рэзкая сатыра на прыдворную знаць і яе прыслужнікаў.

Твор быў забаронен для друку, але хадзіў па руках у спісах і карыстаўся вялікай папулярнасцю.

З гэтага моманту пачынаюцца нягоды ў жыцці Фанвізіна. У гэтым-жа 1783 годзе памёр яго апякун, прыдворны вяльможа Нікіта Іванавіч Панін, і неўзабаве, пасля яго смерці, Фанвізін прымушан быў выйсці ў адстаўку. Літаратурная дзейнасць яго закончылася. У 1788 годзе Фанвізін прабаваў атрымаць дазвол на выданне журнала пад назвай «Друг честных людей». Журнал быў забаронен. Нават пераклад рымскага гісторыка Тацыта не быў дазволен Фанвізіну.

Асабістае сваё жыццё і свой лёс Фанвізін выказаў у адным з сваіх апавяданняў пад назваю «Калісфен». У апавяданні гаворыцца аб мудрацу, які прабаваў навучыць добрадзейна царствацаць Александра Македонскага, але цар, разбэшчаны прыдворнымі і неабмежаванай уладай, зрабіўся гнусным тыранам, яму сталі дакучаць настаўленні мудрага Калісфена; калі-ж Калісфен уголас назваў яго страшыдлам, недастойным імя чалавека, ён быў падвергнут катаванням і памёр у турме. Лёс героя Калісфена ў значнай ступені нагадвае лёс Фанвізіна.

У 1785 годзе Фанвізін пяжка захварэў. Ён ездзіў за-граніцу лячыцца. Не гледзячы на хваробу, ён прадаўжаў цікавіцца тэатрам і літаратурай, зноў прабаваў вярнуцца да літаратурнай дзейнасці, але дні яго былі злічаны. І 11 снежня 1792 года Фанвізін памёр.

Фанвізін па праву заняў пачэснае месца ў гісторыі рускай літаратуры. Ён быў першы рускі празаік і драматург XVIII стагоддзя, творчасць якога лічыцца буйным фактам не толькі рускай, але і еўрапейскай літаратуры.

**Прафесар А. УСС.**

# ГАЗ З ТОРФУ

На багаццю тарфяных масіваў Беларусь ймае адно з першых месц у Совецкім юзе. Беларускі торф вельмі высокай асці і зручна размешчан у адносінах прамысловых прадпрыемстваў.

Да гэтага часу торф, як паліва, прыняецца ў выглядзе кавалкаў і фрэзер. А ў далейшым праектуюцца заводы я брыкетыравання торфу.

Для ліквідацыі разбурэнняў, якія наслі нямецка-фашысцкія захопнікі, і для вых заводаў і энергетычных баз будзе трэбна вялікая колькасць пвёрдага і дкага паліва, а таксама рабочая сіла і анспартныя сродкі для падвозкі, вы- зкі попелу і шлаку. Усё гэта звязана выдаткамі бензіна.

Але мясцовы торф можа замяніць дро- , каменны вугаль, кокс, нафту, бензін, расін і г. д., калі атрымліваць з яго з.

Праблема цэнтральнай газіфікацыі ў ССР з'яўляецца актуальнай і патрабуе акладнага ажыццяўлення.

Тарфяны газ валодае многімі перавага- перад пвёрдым палівам. Ён прадстаўляе сябе паліва зусім бяздымнае і бессярні- ае, што надзвычай важна ў санітарных носінах. Устаноўкі, якія падаюць газ, зваляюць спажыўца ад праны і адпа- дных выдаткаў не толькі па яго да- аўцы, але і па захаванню, а таксама растопцы, па нагляду за топкамі і іх уроўцы, па ачышчэнню ад шлаку і по- лу. Ужыванне газа пазбаўляе прад- ыемствы і ад іншых страт, як перапын- ў рабоце, і г. д. Скарыстанне газа льмі аблягчае прапяканне тэхналагічных прапэсаў, якія патрабуюць абагрэву. жываючы газ, можна не толькі лёгка гуліраваць тэмпературу, таксама як ы вадкім гаручым, але і лёгка атрымваць доўгае полымя, якое амывае на- аваемы прадмет. Таксама лёгка можна канцэнтраваць гарэнне ў кароткім полымі, даваць ступеньчатае падраздзяленне гарэння або размяркоўваць яго па асобных кропках абаграваемага прадмета. Газавае полымя можна прыстасоўваць для задавальнення спецыфічных запатрабаванняў пячной атмасферы, робячы яго акісліцельным або аднаўленчым. Пры скарыстанні газа можна весці папярэднее змяшанне яго з паветрам. Ад гэтага хуткасць гарэння павялічваецца, гарэнне канцэнтруецца і атрымліваецца высокая тэмпература полымя.

Пры адпаведным піску газа ў трубаправодах ёсць энергія, дастатковая для таго, каб падвесці паветра для гарэння і пераадолець супраціўленне пячэння газаў у топцы. Гэта аслабляе залежнасць працэса гарэння ад дымавой трубы і пягі і вельмі важна ва ўмовах разгортвання новых будоўляў. Гэтыя акалічнасці, а таксама магчымасць хуткай пабудовы газавых станцый і газанагравальных апаратаў даюць вялікую перавагу гэтаму віду паліва перад пвёрдым.

Пры спальванні пвёрдага апалу, асабліва ў топках невялікага і сярэдняга маштабаў, практычна ўпускаюць у топку да 70 процантаў больш паветра, чым гэта патрабуецца па тэарэтычных разліках. У выніку атрымліваецца вялікае ахаладжэнне топкі і пяпло ўносіцца праз трубу ў атмасферу.

Для гарэння газа паветра ўводзіцца ў строгай адпаведнасці з неабходнасцю для найлепшага гарэння, таксама як і пры вадкім гаручым. Тэрмічны каэфіцыент карыснага дзеяння газа значна вышэй супроць пвёрдага паліва, у якім-бы выглядзе апошняе не прымянялася.

Газ можна ўжываць у любых рухавіках унутранага згарання замест вадкага гаручага, а таксама і для плаўкі чыгуна, у мартэнаўскіх і загартавальных печах, а ў выпадку неабходнасці і для асвятлення.

У прамысловасці з газам можа канкурыраваць толькі нафта, у бытавой гаспадарцы—толькі электрычнасць. Эканоміка цэнтралізаванага газавага забяспечання патрабуе стварэння комплексных прадпрыемстваў газа-хімічнага тыпу. Гэта дасць магчымасць скарыстаць пабочныя адыходы ад газавай выпрацоўкі, як дзёгаць, тарфяную смалу, крэазот, карболавую і вопатную кіслоты, воск, парафін, аміяк, серу і г. д., якія не менш каштоўны, чым сам газ. А лішкі цеплыні можна скарыстаць для падагрэву вады. Каштоўнай уласцівасцю газа таксама з'яўляецца магчымасць размеркавання і перадачы яго на вялікую адлегласць. Патрэбна ўлічыць і тое, што цеплатворная здольнасць торфу залежыць ад атмасферных умоў. Сыры торф менш эфектыўны. Пры газафікацыі ад гэтых умоў мы залежаць не будзем.

Для атрымання больш высокіх тэмператур у газ можна ўводзіць абагаціпелі. Гэта дазволіць праводзіць газазварку, газарэзку і металізацыю. Шматгаловае прымяненне газа на буйнейшых машынабудаўнічых і металургічных заводах Урала дала выдатныя вынікі.

Перад прамысловасцю і комунальнымі прадпрыемствамі Беларусі стаіць зараз баявая задача—паўсямесна і шырока скарыстаць торф ва ўсіх яго відах, уключаючы і газафікацыю.

Будаўніцтва газавай станцыі і сеткі можна ажыццявіць выключна з мясцовых матэрыялаў. Трубы для газаправодаў можна вырабляць керамічныя або з цэглы.

Першую вопытную газахімічную станцыю добра было-б пабудаваць на аршанскіх торфамасівах з падачай газа Асінстрою або групе заводаў. Можна такую станцыю пабудаваць і пад Мінскам з падачай газа многім заводам сталіцы.

**Г. СПІРЫДОНАЎ,**

**кіраўнік секцыі стале-чыгуннага ліцця Акадэміі навук БССР.**

# НАПЯРЭДАДНІ ПЕРАХОДНЫХ ІСПЫТАЎ І ВЫПУСКНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ Ў ШКОЛАХ

Звыш 1 мільёна 200 тысяч школьнікаў пасля вызвалення рэспублікі селі за парты. Яны зноў атрымалі права вучыцца. У 10.440 адноўленых школах шчаслівае падрастаючае пакаленне выхоўваецца 34-тысячным атрадам настаўнікаў. Зараз у школьнікаў і педагогаў насталі дні напружанай работы— набліжаюцца выпускныя экзамены і пераводныя іспыты. У гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА намеснік народнага камісара асветы БССР тав. Умрэйка расказаў:

— Лічаныя дні аддзяляюць школьнікаў ад пачатку дзяржаўнай праверкі іх ведаў. За гэты параўнаўча кароткі тэрмін вучням і педагогам прадстаіць правесці вялікую работу :

У гэтым годзе ўпершыню ў школах Беларусі, як і ва ўсім Совецкім Саюзе, у 4-х і 7-х класах будуць праводзіцца выпускныя экзамены, у 10-х класах—экзамены на атэстат спеласці і ў 5-х, 6-х, 8-х, 9-х класах—пераводныя іспыты.

У гэтым навучальным годзе для выпускных 4-х, 7-х і 10-х класаў школы атрымаюць распрацаваныя Наркамасветы БССР адзіныя экзаменацыйныя білеты. Гэтае мерапрыемства мае вялікае значэнне. У білеты ўваходзяць усе пытанні не толькі бягучага навучальнага года, але і мінулых гадоў. Настаўнікі павінны зараз-жа дапамагчы выпускнікам азнаёміцца з аб'ёмам і характарам запатрабаванняў на экзаменах, устанавіць, якія раздзелы праграмы засвоены недастаткова цвёрда. Пры паўтарэнні асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць гэтым прабелам. Важна растлумачыць вучням, што на экзаменах яны павінны даваць поўныя і разгорнутыя адказы на пытанне білета, што мала сфармуліраваць закон, назваць гістарычную падзею або дату—трэба раскрыць сутнасць падзеі, паказаць дзейнічанне закона на прыкладах, праявіць сапраўдную глыбіню ведаў.

Тэмы пісьмовых работ па літаратуры, тэксты дыктовак, прыклады і задачы пісьмовых работ па матэматыцы распрацоўваюцца таксама Наркамасветы БССР і рассылаюцца праз абласныя аддзелы народнай асветы дырэктарам або загадчыкам школ для выпускных класаў за 5 дзён да пачатку экзаменаў. Для 5-х, 6-х, 8-х і 9-х класаў білеты для пераводных іспытаў складаюцца школамі. Да гэтай работы трэба прыступіць ужо цяпер. Спешкі ў гэтай справе не павінна быць. Ні ў якім выпадку нельга дапускаць, каб у білетах аказаліся аблегчаныя пытанні або задачы.

Вучні 1-х, 2-х і 3-х класаў экзаменам або іспытам не падлягаюць. Яны пераводзяцца або пакідаюцца на паўторны курс у залежнасці ад іх паспяховасці на працягу навучальнага года. Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць 10-класнікам. Яны здаюць экзамены на атэстат спеласці. Гэта вялікая падзея ў жыцці кожнага юнака і дзяўчыны. Выпускнікі 10-х класаў павінны аднесціся да экзаменаў з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Яны павінны памятаць, што атэстат спеласці змогуць атрымаць толькі тыя вучні, якія не будуць мець ніводнай дрэннай адзнакі і будуць дысцыплінаваны. Прымаць экзамены па атэстат спеласці будуць спецыяльныя камісіі, кожны член якой павінен мець вышэйшую педагагічную асвету. Ніякіх аслабленняў гэтыя камісіі рабіць экзаменуючымся не будуць.

Праводзімыя іспыты і выпускныя экзамены павінны ператварыцца не толькі ў дзяржаўную праверку ведаў вучняў, але і павінны паказаць поспех работы школ у першым навучальным годзе пасля вызвалення рэспублікі ад нямецкіх захопнікаў.

(БЕЛТА).

На рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці.
Бешыніцкі калгасны хор выконвае парты занскую лірычную песню. Музыка былога партызана М. Быкадорава.
На пярэднім плане — салісты Г. Кардаш (злева) і І. Гілько, у цэнтры — М. Быкадораў.

## *БІБЛІЯГРАФІЯ*

# ПРА ВЯЛІКАЕ СЭРЦА*)

Смерць заўчасна вырвала з нашых радоў выдатнага беларускага пісьменніка — Кузьму Чорнага. Але асталіся жыць яго прытожыя творы, творы аб простых і шчырых совецкіх людзях, аб іх думах і справах.

Чытач ведаў да вайны Кузьму Чорнага пераважна як раманіста, аўтара буйных аповесцей. Але ў часе Айчыннай вайны, не забываючы і аб буйных формах, К. Чорны стаў публіцыстам, пісаў артыкулы, фельетоны, кароткія навелы. Абставіны клікалі пісьменніка гаварыць са сваім чытачом, са сваім народам літаральна штодзённа, штогадзінна і ён, верны гэтаму клічу, сваім гнеўным і палкім словам дапамагаў узнімаць народ на бязлітасную барацьбу з ворагам. К. Чорны ў гэты час быў не толькі пісьменнікам, а і журналістам, прымаў актыўны ўдзел у газеце, ведаючы, што праз яе хутчэй будзе пачут яго голас.

За час Айчыннай вайны К. Чорны напісаў і рад кароткіх апавяданняў. Гэтыя апавяданні выйшлі нядаўна ў свет у зборніку «Вялікае сэрца».

Тэма апавяданняў зборніка «Вялікае сэрца» — гэта барацьба беларускіх людзей супроць крывавых ворагаў—немцаў, што прыйшлі на зямлю нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, каб заняволіць і яе і яе людзей.

Па-майстэрску, з пачуццём сапраўднага майстра і знаўца чалавечай душы паказвае К. Чорны як расце ў народзе, у кожным совецкім патрыёце гнеў і нянавісць да немцаў, як гэты гнеў ператвараецца ў бязлітасную помсту ворагу. Пісьменнік часта наўмысна ставіць героямі сваіх апавяданняў людзей у нядаўнім ціхіх, маўклівых, «не ўмеючых і курыцу зарэзаць». Кантрастам такому стану чалавечай натуры гучыць бура, выкліканая ў гэтых людзях крывавымі ўчынкамі немцаў. Ціхія, мірныя характарам людзі робяцца грознымі мсціўцамі; і не астаецца ні ў адным чэсным чалавечым сэрцы ні малейшага месца для спагады, або літасці да ворага.

У гэтым сэнсе надзвычай цікавы герой апавядання «Вялікае сэрца» — Пархвен Катлубовіч, які раней выславіўся толькі тым, што «біўся з п'яным пеўнем». Пархвен не мог нікога пакрыўдзіць, быў маўклівы, ціхі. У канцы апавядання мы сустракаем Пархвена зусім іншым — немцы разлілі яго сэрца і яно зрабілася жорсткім. Ад нямецкай расправы загінула любімая дачка Пархвена — Марыля, у агні згарэла вёска, у якой ён жыў. І за ўсё гэта пачаў Пархвен бязлітасна помсціць немцам.

Калі сяляне забілі нямецкага сельскагаспадарчага афіцэра, карнікі сагналі ўсё мостачковае насельніцтва на плошчу і заявілі:

— Не выдасьце таго, хто забіў афіцэра, усіх расстраляем.

У натоўпе аказаўся Пархвен. Ён прыняў на сябе віну за забойства афіцэра, каб выратаваць сотні нявінных людзей. І гэта не з-за пакоры зрабіў ён, а з-за благародства. Так выратаваў ён сваіх аднасельчан. Выратаваўся ён і сам — на дапамогу прыйшлі партызаны.

Пра мужную, благародную душу совецкага чалавека расказвае Чорны ў апавяданні «Бацька».

Гераіню апавядання катуюць немцы, дабіваючыся таго, каб яна сказала, дзе яе брат Юрась. Жанчына маўчала. Да яе прывялі дачку Настачку. «Калі ты не скажаш—яна (немец ткнуў пальцам у твар Настачкі) зараз будзе мёртвая». Жанчына маўчала. Немец выстраліў у Настачку. І мужная маці, перажыўшы ўзрыў невыказнага гора, ускліснула:

— Наш Юрась адпомсціць за Настачку. У яго руках зброя. І я вам не скажу, дзе ён. Мой муж у Чырвонай Арміі. І Чырвоная Армія адпомсціць. І не будзеце вы панаваць над намі. Ніколі вы не дазнаецеся ад мяне, дзе Юрась.

Пры немцах людзі не мелі жыцця. Не мелі радасці, якой жылі яны да вайны. І жыццё, і радасць былі ў барацьбе. Барацьба з немцамі была сэнсам іх жыцця, іх радасці.

Калі бацька пакутніцы, загінуўшай, але не выдаўшай немцам свайго брата, забіў першага немца, ён адчуў, што «радасць, вялікая, вартая ўсяго жыцця, ахапіла чалавека. Ён цэліўся і страляў і забыўся на ўсё, апроч гэтай радасці».

Дзяўчынка, гнаная нямецкімі бомбамі, асвятлілася радасцю толькі тады, калі ўбачыла першага забітага немца і «моментам гэтай радасці скончылася яе адзінота, таксама як і яе маленства. Прыйшла сталасць на доўгі яе век».

І старык — герой аднаго з апавяданняў — толькі пасля таго, як забіў немца, палічыў магчымым падумаць аб уласнай смерці.

Героі апавяданняў К. Чорнага — простыя совецкія людзі. І яны робяць подвігі, бліскучыя подвігі, бо бязмежная і ў іх вялікіх сэрцах любоў да радзімы, да зямлі сваёй і такая-ж бязмежная ў іх нянавісць да ворага. Такіх людзей не сагнулі ні нямецкі бізун, ні нямецкія кулі. Як волаты, стаялі яны перад навалай, як той дуб каля хаты Пархвена Катлубовіча (Апавяданне «Вялікае сэрца»), якога не адолелі немцы ні сілай, ні агнём, ні сякерай. Вялізны каранасты дуб стаяў каля хаты Катлубовіча. Ен мазоліў немцам вочы, бо з-за яго густога галля яны не маглі аглядаць у бінокль навакольную мясцовасць. Немцы загадалі спілаваць дуб, але «дуб быў у некалькі абхватаў і таўсцейшы за даўжыню піл. Пілы рваліся, а дуб стаяў». Тады немцы загадалі пакласці вакол дуба сажні дроў і падпаліць яго. Але «за гадзін дзве дровы згарэлі, дуб знізу абсмаліўся, і агонь патух». Тады немцы загадалі паліцэйскаму абцерабіць дуб, і ён палез на яго са словамі:

— Колькі яго ні пілілі, усёроўна закрывае дарогу. От-бо ўдаўся, і агонь яго не бярэ.

Пра дуб у аўтара больш нічога не сказана. Але ў памяць чытача запала такая дэталь: на абпаленым, на абцярэбленым дубе асталася адна зелянеючая жывая галінка. І сам чытач даскажа гісторыю з дубам. Магутны дуб будзе жыць, і з адной жывой галінкі пачнецца яго новае адраджэнне, зазеляненае ён зноў, зноў нальецца сокам магутнасці.

У гэтым дубе проста, сімвалічна паказаў Кузьма Чорны сілу нашага народа, неўміручую, непераадольную сілу нашай роднай зямлі.

Кніга «Вялікае сэрца» — гэта кніга пра сапраўды вялікае сэрца совецкіх людзей, пра іх благародную душу, пра іх непахісную мужнасць у барацьбе за чэсць і свабоду сваёй маці-Радзімы.

* * *

На жаль, прыходзіцца адзначыць прыкрую выдавецкую неахайнасць: канец апавядання «Гора» падверстан чамусьці ў канец апавядання «Смерць» і наадварот. Пра гэтую недарэчнасць выдавецтва чамусьці не палічыла неабходным папярэдзіць чытачоў хоць-бы спецыяльнай уклейкай.

**В. ПЯТРОЎ.**

*) Кузьма Чорны «Вялікае сэрца». Апавяданні. Дзяржаўнае выдавецтва БССР.

# СТАНОВІШЧА НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

ЛОНДАН, 11 красавіка. (ТАСС). Як перадае лонданскае радыё. пяхотныя і танкавыя часці 9-й амерыканскай арміі пачалі бітву за Брауншвейг.

Супраціўленне нямецкіх войск паміж Гановерам і Брэменам рушыцца. Саюзныя войскі наступаюць амаль бесперашкодна.

Ва ўнутранай частцы Рурскага «мяшка» 17-я амерыканская дывізія заняла горад Эсен. Немцы аказалі толькі нязначнае супраціўленне.

Занят таксама Гановер. Ваенныя карэспандэнты паведамляюць, што ў баях за горад, апрача танкавых часцей, удзельнічалі амерыканскія пехацінцы ў саставе адной роты, якая налічвала 200 чалавек.

Заняцце Гановера папярэднічала выключна хуткае прасоўванне саюзных войск па Паўночна-заходняй і Сярэдняй Германіі. Насельніцтва многіх гарадоў было захоплена знянацку. Танкавыя часці паяўляліся тут раптоўна і ўслед за імі ў горад уступала пяхота. У многіх выпадках саюзныя танкі праязджаюць міма гарадоў, не затрымліваючыся тут. Затым пяхота займала горад і перадавала яго ва ўпраўленне саюзнай ваеннай адміністрацыі.

# ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 11 красавіка (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў, пераадолеўшы моцнае супраціўленне праціўніка, занялі Дзевентэр (Галандыя).

Войскі саюзнікаў знаходзяцца зараз усяго толькі ў 8 кілометрах ад Брауншвейга. Аўтастрада Гановер—Брауншвейг перарэзана саюзнікамі па поўшляху паміж гэтымі гарадамі.

Не гледзячы на моцны артылерыйскі агонь праціўніка, войскі саюзнікаў абкладі з трох бакоў горад Швейнфурт. Бронетанкавыя часці саюзнікаў, якія наступаюць на Швейнфурт з поўдня, занялі 24-кілометравы участак берага ракі Майн.

У раёне Рурскага «мяшка» войскі саюзнікаў прасунуліся ў паўднёвым напрамку да ракі Рур да пункта на ўсходзе ад Эсена і занялі некалькі невялікіх гарадоў на захадзе ад Дортмунда. Адбіты дзве моцныя контратакі праціўніка на паўночным захадзе і захадзе ад Дортмунда.

* * *

ЛОНДАН, 12 красавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў пачалі наступленне праз раку Ісель (Вестфалія). На поўначы ад Оснабрука саюзнікі занялі Брамшэ. На паўднёвым захадзе ад Брэмена войскі саюзнікаў занялі Гарштэдт. На ўсходзе ад гэтага раёна праціўнік аказвае моцнае супраціўленне.

Бронетанкавыя часці саюзнікаў, прасунуўшыся больш чым на 80 кілометраў ва ўсходнім напрамку, дасягнулі ракі Эльба ў раёне Магдэбурга пасля таго, як яны ўзялі ў клешчы Вольфенбютэль на поўдні ад Брауншвейга. Пяхотныя часці саюзнікаў хутка прасоўваюцца ў аколіпах Гальберштадта.

Саюзнікі занялі Остэрхаген, на паўночным захадзе ад Дудэрштадта. Танкавыя часці саюзнікаў ачысцілі ад праціўніка Нордгаузен і дасягнулі Більшынгслебена, на ўсходзе ад Мюльхаузена. Прайшоўшы 35 кілометраў, яны падышлі на адлегласць паўтара кілометра да Кёледа, на паўднёвым захадзе ад гэтага раёна.

На паўднёвым захадзе ад Кобурга саюзнікі некалькі прасунуліся, пераадольваючы супраціўленне асобных часцей праціўніка.

Саюзнікі ўступілі ў Швейнфурт, які перад гэтым быў фактычна акружан. У горадзе адбываюцца цяжкія вулічныя баі. Танкавыя часці саюзнікаў прасунуліся ўздоўж ракі Майн, на ўсходзе і на поўдні. На паўднёвым усходзе ад гэтага раёна войскі саюзнікаў прасунуліся на 6,5 кілометра ўздоўж шасе, якое злучае Оксенфурт і Ансбах, і занялі Уфенгейм і Рудольцхофен.

Танкавыя часці саюзнікаў некалькі адышлі ў раёне Крайльсхейма, захапіўшы 1.500 палонных і трафеі. Прадмостнае ўмацаванне саюзнікаў на рацэ Кохер (Вюртэмберг) расшырана да 5 кілометраў у глыбіню. Два прадмостныя ўмацаванні саюзнікаў на рацэ Некар злучыліся. Саюзнікі прасунуліся на 5 кілометраў на паўднёвым усходзе ад Карлсруэ. Прадмостнае ўмацаванне саюзнікаў на рацэ Эпц, на ўсходзе ад Пфорцгейма, расшырана. На працягу 10 красавіка саюзнікі ўзялі 25.846 палонных.

У раёне Рурскага «мяшка» пяхотныя часці саюзнікаў ачысцілі ад праціўніка Эсен, занялі Гельзенкірхен і ўступілі ў Бохум. На захадзе ад Мешэдэ (Вестфалія) саюзнікі занялі Фрэйэноль. Пяхотныя часці саюзнікаў, якія наступаюць у раёне на поўначы ад Зігена, занялі Атэндорф. Танкавыя часці саюзнікаў некалькі прасунуліся на поўначы ад Зігбурга.

Буйныя злучэнні пяжкіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні знішчальнікаў зрабілі налёт на нафтасховішчы, склады боепрыпасаў і аэрадром у Рэгенсбургу, аэрадром і чыгуначнае дэпо ў Інгольштадтэ, завод узрыўчатых вяшчэстваў у Крайбургу, на ўсходзе ад Мюнхена, склад боепрыпасаў у Ландсгуце і нафтасховішчы ў Фрэйтаме, на захадзе ад Мюнхена.

Сярэднія бамбардыроўшчыкі і знішчальнікі-бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на чыгуначныя аб'екты ў раёне Эмдэна, Брэмена, Гамбурга і Гановера.

Буйныя злучэнні сярэдніх і лёгкіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёт на чыгуначнае дэпо ў Кётэне і Цвікау і на завод аўтамашын у Бамбергу.

Лёгкія бамбардыроўшчыкі ў ноч на 12 красавіка зрабілі налёт па Берлін.

### ВАЙНА НА ЦІХІМ АКІЯНЕ

ЛОНДАН, 11 красавіка. (ТАСС). Штаб аб'еднанага камандавання ўзброеных сіл саюзнікаў у паўднёва-заходняй частцы Ціхага акіяна паведамляе, што 9 красавіка амерыканскія войскі высадзіліся на востраве Джоло (архіпелаг Сулу), захапілі галоўны горад гэтага вострава і ў сучасны момант устанавілі свой кантроль над усім архіпелагам Сулу. (Гэты архіпелаг складаецца з дробных астравоў, якія знаходзяцца паміж паўднёвай аканечнасцю Філіпін і паўночным узбярэжжам вострава Барнео).

У паўднёвай частцы вострава Лусон (Філіпіны) арганізаванае супраціўленне японцаў спынілася.

ВАШЫНГТОН, 11 красавіка. (ТАСС). Штаб Ціхаакіянскага флота ЗША паведамляе, што часці амерыканскай пяхоты занялі востраў Цуген, які знаходзіцца ў 10 мілях на ўсходзе ад вострава Окінава.

### НАЛЁТ НА ТОКІО

ВАШЫНГТОН, 12 красавіка (ТАСС). Ваеннае міністэрства ЗША паведамляе, што сёння днём звышмагутныя «Лятаючыя крэпасці» зрабілі налёт на Токіо.

ТОКІО, 12 красавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Домей Цусін, сёння раніцай прыблізна 150 цяжкіх бамбардыроўшчыкаў «Б-29», якія базіруюцца на Марыянскія астравы, зрабілі налёт на заходнія раёны Токіо і раён Сідзуока. Налёт прадаўжаўся дзве гадзіны.

# Мітынгі і дэманстрацыі у Белградзе ў чэсць падпісання дагавора з Совецкім Саюзам

БЕЛГРАД, 12 красавіка. (ТАСС). У белградскія газеты апублікавалі сёння на першых старонках паведамленне аб падпісанні дагавора аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Совецкім Саюзам і Югаславіяй і поўны тэкст Дагавора.

Газета «Палітыка» на першай старонцы змясціла партрэты таварышоў Сталіна і Молатава і Маршала Тіто.

У горадзе пануюць нябывалы ўздым ажыўлення. Адразу-ж пасля атрымання паведамлення аб падпісанні дагавора ў горадзе месц адбыліся мітынгі.

Вечарам адбылася масавая дэманстрацыя насельніцтва горада, прысвечаная падпісанню дагавора з Совецкім Саюзам. На мітынгу выступілі сустрэтыя бурнымі апладысментамі міністр прамысловасці Югаславіі Хебранг, міністр земляробства Сербіі Смілянич і палкоўнік Бакіч. Раздаваліся прывітальныя воклічы ў чэсць Маршала Сталіна, Чырвонай Арміі і совецкага народа. Пасля мітынга калоны дэманстрантаў накіраваліся да будынка совецкага пасольства. Удзельнікі маніфестацыі ў сваіх воклічах віталі Совецкі Саюз і ўсяляк імкнуліся выказаць радаснае пачуццё, выкліканае падпісаннем совецка-югаслаўскага дагавора.

### ЗАЯВА ЧЭРЧЫЛЯ АБ СТРАТАХ УЗБРОЕНЫХ СІЛ БРЫТАНСКАГА САДРУЖАСТВА НАЦЫЙ

ЛОНДАН, 11 красавіка. (ТАСС). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр, прэм'ер-міністр Чэрчыль заявіў учора ў палаце абшчын, што з часу ўзнікнення вайны і да канца лютага гэтага года страты ўзброеных сіл брытанскага садружаства нацый складалі 1.126.802 чалавекі, у тым ліку 306.984 чалавекі забітымі.

Узброеныя сілы Злучанага Каралеўства страцілі 685.638 чалавек; Канады—89.22 чалавек; Аўстраліі—87.256 чалавек; Індыі—163.486 чалавек і г. д.

Колькасць афіяр у сувязі з вайной сярод грамадзянскага насельніцтва Злучанага Каралеўства складае, па заяве Чэрчыля, 144.542 чалавекі.

### СТАНОВІШЧА У ГРЭЦЫІ

АФІНЫ, 10 красавіка. (ТАСС). У сувязі са зменай грэчаскага кабінета кіраўніцтва грэчаскай кампартыі Сантос зрабіў наступную заяву:

«Стварэнне новага ўрада з'явілася вынікам даўлення манархічна-фашысцкай правай. Яго сфарміраванне прадстаўляе антыканстытуцыйнае дзеянне—свайго роду змову супроць канстытуцыі, таму што дзве вялікія палітычныя плыні—старыя дэмакратычныя партыі і рух нацыянальнага супраціўлення—былі супроць змены ўрада пад уплывам шантажу манархістаў-фашыстаў».

Указаўшы, што ўрад Вулгарыса павінен уступіць месца прадстаўнічаму ўраду, Сантос заяўляе: «Адказнасць, якую бярэ на сябе рэгенцтва, прымаючы гэтае дзіўнае рашэнне, велізарная. Спасылка на «пазагрэчаскія фактары» зусім не можа служыць апраўданнем».

У заключэнне Сантос заклікае ўсіх яго правых, так і левых дэмакратаў змагацца за «выратаванне радзімы, за дэмакратычныя свабоды, за спакой і прагрэс краіны».

### ЗВАРОТ АРГАНІЗАЦЫІ «РУХ СВАБОДНЫХ АЎСТРЫЙЦАЎ» ДА АЎСТРЫЙСКАГА НАРОДА

ЛОНДАН. (ТАСС). Аўстрыйская газета «Цэйтшпігель», якая выдаецца ў Лондане, публікуе заяву «Руху свабодных аўстрыйцаў», у якой гаворыцца: 29 сакавіка Чырвоная Армія перайшла граніцу Аўстрыі. Мы, што аб'ядналіся ў «Рух свабодных аўстрыйцаў», вітаем Чырвоную Армію. Мы вітаем дзень, калі пачалося вызваленне нашай краіны. Мы заклікаем усіх аўстрыйцаў ва ўсім свеце, салдат саюзных армій, рабочых, вучоных, мужчын і жанчын усіх прафесій зрабіць усё ад іх залежачае для канчатковай перамогі.

Адказны рэдактар
**В. САМУЦІН.**


## Сёння у кінотэатрах:

Кінотэатр «Першы»
«НАШЭСЦЕ»
Пачатак сеансаў у 12, 14, 16, 18, 20, 22 гадз.

Кінотэатр «Беларусь»
«ТРЫНАЦЦАЦЬ»
Журнал «НАВІНЫ ДНЯ» № 7
Пачатак сеансаў у 12, 13 г. 50 м., 15 г. 30 м., 17 г. 15 м., 19 г. 5 м., 21 гадз.

Кінотэатр «Радзіма»
«МАЯ ЛЮБОЎ»
Пачатак сеансаў у 20, 22 гадз.

Дзіцячы кінотэатр
1. «ТВАР ФЮРЭРА»
2. «СТАРЫ МЛЫН»
3. «КАЗКА ПРА ЦАРА САЛТАНА»
4. Кіножурнал «НА СТАДЫЕНЕ ДЫНАМА».
Пачатак сеансаў у 10, 11 г. 30 м., 13 г. 15 м., 14 г. 45 м., 16 г. 30 м., 18 г. 15 м.

МІНСКАМУ АДДЗЯЛЕННЮ ГАЛОЎСНАБА НКМП
**патрабуюцца:**
галоўны бухгалтар, экспедытар, шофер, вартаўнікі і рабочыя.
ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: г. Мінск, Смаленская, 13.

УПРАЎЛЕННЮ ПРАМ. ТЭХНІЧНАГА СНАБЖЭННЯ І ЗБЫТУ ЛЯСНОЙ ПРОМКААПЕРАЦЫІ БЕЛАРУСІ
**патрабуюцца**
на сталую работу:
шоферы на грузавых машынах, галоўны бухгалтар, таваразнавец, загадчык базы, планавік, грузчыкі на аўтамашынах і вартаўнікі.
ЗВЯРТАЦЦА: г. Мінск, Неміга, № 31, 3-ці паверх.

Беларуская Дзяржаўная Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Філармонія
у памяшканні Акруговага Дома Чырвонай Арміі
Сёння, 13 красавіка, у 20 гадзін і ў нядзелю 15 красавіка ў 12 гадзін
**ГАСТРОЛІ**
**Маскоўскага акрабатычнага ансамбля Цэнтральнага Дома культуры чыгуначнікаў**
(у саставе 60 артыстаў).
Білеты ў касе АДЧА з 14 гадзін.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА МІНСКА
**АДКРЫТА АПТЭКА**
АДРАС: Кагановіцкі р-н, рог Магілеўскай і Барысаўскай вуліц, д. № 82.
Мінскае абласное аптэкаўпраўленне.

МІНСКАМУ АБЛАСНОМУ АПТЭКАЎПРАЎЛЕННЮ
**патрабуюцца:**
галоўны бухгалтар, бухгалтар-рэвізор, інспектар па нарыхтоўцы лякарственых траў і планавік.
ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: вул. Максіма Горкага, № 1, Аблаптэкаўпраўленне.

Мінскаму абласному спецгандлю
**ПАТРАБУЮЦЦА:**
чорнарабочыя на падсобныя гаспадаркі, якія размешчаны за горадам, майстры, краўцы, шаўцы і вартаўнікі.
Рабочыя забяспечваюцца харчаваннем і неабходнай вопраткай і абуткам.
ЗВЯРТАЦЦА ПА АДРАСУ: Інтэрнацыянальная, 10, з 9 да 13 гадзін. Тэл. камутатар НКВД № 38.

Кінотэатр „Першы"
з 16 красавіка
ДАКУМЕНТАЛЬНЫ КІНОФІЛЬМ
**„Крымская канферэнцыя"**
(Канферэнцыя кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў—Совецкага Саюза, Злучаных Штатаў Амерыкі і Вялікабрытаніі).
Кіраўнік з'ёмак—лаўрэат Сталінскай прэміі С. ГЕРАСІМАЎ.
Рэжысёр — лаўрэат Сталінскай прэміі І. КАПАЛІН.
Здымалі аператары—лаўрэаты Сталінскай прэміі: І. БЕЛЯКОЎ, В. ДОБРАНІЦКІ, А. КРЫЧЭЎСКІ, аператары — А. ХАЎЧЫН, Р. ХАЛУШАКОЎ.
Тэкст чытае — Л. ХМАРА.
Музафармленне — Д. БЛОК.
Гукааператары — І. ГУНГЕР, В. НЕСЦЕРАЎ.
ВЫТВОРЧАСЦЬ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ОРДЭНА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА СТУДЫІ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ФІЛЬМАЎ (1945 г.).
Прымаюцца калектыўныя заяўкі

Інстытут Гісторыі Акадэміі Навук Беларускай ССР
арганізоўвае ў пятніцу 13 красавіка 1945 г.
У памяшканні Дома партыйнай асветы (Совецкая вул., 108)
**ПУБЛІЧНУЮ ЛЕКЦЫЮ**
СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА ІНСТЫТУТА Ф. Т. КАНСТАНЦІНАВА НА ТЭМУ
«УЗЯЦЦЕ БЕРЛІНАРУСКІМІ ВОЙСКАМІ У 1760 ГОДЗЕ».
Пачатак роўна ў 19 гадзін вечара.
Запрашаюцца партыйны, совецкі, комсамольскі актыў, настаўніцтва, навуковыя работнікі, студэнты, вучні старшых класаў сярэдняй школы і ўсе жадаючыя.
ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

З 5 ПА 15 КРАСАВІКА У ПАМЯШКАННІ БІБЛІЯТЭКІ ІМЕНІ ЛЕНІНА
(Чырвонаармейская вул.)
**адкрыта выстаўка конкурсных праектаў**
ЗАБУДОВЫ ЦЭНТРА ГОРАДА МІНСКА І ПЛАНІРОЎКІ ПАСЕЛІШЧАЎ КАЛГАСАЎ РУДЗЕНСКАГА РАЁНА.
Выстаўка адкрыта з 12 да 19 гадзін.
УВАХОД СВАБОДНЫ.


## ВЫЙГРЫШЫ І ЎКЛАДЫ Ў АШЧАДНЫЯ КАСЫ

# АФІЦЫЯЛЬНАЯ ТАБЛІЦА

ДРУГОГА АБ'ЕДНАНАГА ТЫРАЖА ВЫЙГРЫШАЎ, які АДБЫЎСЯ 8-ГА КРАСАВІКА 1945 ГОДА У Г. МІНСКУ.

ВЫЙГРЫШЫ ВЫПАЛІ НА НАСТУПНЫЯ НУМАРЫ РАХУНКАЎ ПА ВЫЙГРЫШНЫХ УКЛАДАХ ВА ЎСІХ АШЧАДНЫХ КАСАХ МІНСКАЙ, ВІЦЕБСКАЙ, БРЭСЦКАЙ, ГРОДНЕНСКАЙ, МАЛАДЗЕЧНЕНСКАЙ, БАРАНАВІЦКАЙ І ПОЛАЦКАЙ АБЛАСЦЯХ БЕЛАРУСКАЙ ССР.

| №№ рахункаў | Размер выйгрыша ў процантах да сярэдняй сумы уклада | №№ рахункаў | Размер выйгрыша ў процантах да сярэдняй сумы уклада |
|---|---|---|---|
| 23 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 549 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 47 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 576 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 92 | 100% (сто проц.) | 605 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 135 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 656 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 181 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 689 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 200 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 722 | 200% (двесце проц.) |
| 271 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 775 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 319 | 100% (сто проц.) | 810 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 323 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 866 | 50% (пяцьдзесят проц. |
| 379 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 912 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 419 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 959 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 448 | 50% (пяцьдзесят проц.) | 983 | 50% (пяцьдзесят проц.) |
| 481 | 50% (пяцьдзесят проц.) | | |

У ашчадных касах, дзе лік рахункаў больш 1000, выйгралі ва ўсіх паследуючых тысячах тыя-ж нумары рахункаў, што і ў першай тысячы, г. зн. рахункі за №№ 1023, 2023, 3023 або 1047, 2047, 3047 і г. д.

Старшыня тыражнай камісіі, Старшыня выканкома Мінскага Абласнога Совета дэпутатаў працоўных
Р. МАЧУЛЬСКІ.

Намеснік Старшыні Тыражнай Камісіі Загадчык Абласнога Фінансавага Аддзела
Ф. КАЗНІН.

Намеснік Старшыні Тыражнай Камісіі Начальнік Упраўлення Дзяржпрацашчадкас і Дзяржкрэдыту Мінскай обласці
Е. ЛІЗГАРО.

ЧЛЕНЫ ТЫРАЖНАЙ КАМІСІІ:
Намеснік старшыні выканкома Мінскага Абласнога Совета Дэпутатаў працоўных
К. ДОМАРАД
Сакратар Сталінскага райкома КП(б)Б
БАБРОЎ.
Сакратар Варашылаўскага Райкома КП(б)Б
ЖУКАЎ.
Старшыня Выканкома Кагановіцкага Райсовета Дэпутатаў Працоўных
ШКАДАРЭВІЧ.
Прадстаўнікі камісій садзейнасці Дзяржаўнаму Крэдыту і ашчаднай справе:
БУЛАЎСКІ, НЕЙФАХ, РЭКС.
Адказны сакратар Тыражнай камісіі
ІВАНЧЫКАВА

АТ28720 АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск. вул. Пушкіна, 55. 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.